ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 40 (794) | Субота, 30 верасня 1950 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.

Арганізавана пачаць марксісцка-ленінскую вучобу (перадавы артыкул).

В. Талстая. — Выстаўка балгарскага выяўленчага мастацтва.

Я. Цікоцкі. — Песні ў абарону міру.

Н. Туроўнікаў. — Партыйная вучоба мастакоў.

Другая старонка.

Н. Асанаў. — Нашчадкі вялікіх традыцый.

З. Сюбарава. — Аднавіць слуцкую бэру.

Трэцяя старонка.

Б. Бур'ян. — Натхнёнае слова паэта.

К. Санкевіч. — Прапаганда кнігі ў раённай газеце.

В. Стральцоў. — У мастацкім совеце кіностудыі «Беларусьфільм».

Чацвертая старонка.

А. Палеес. — Рэпін на Беларусі.

Ів. Кудраўцаў. — Старыя недахопы ў новых выданнях.

К. Папкоўскі. — Кнігі ляжаць на складах.

Н. Каменскі. — Здзіўляючая абыякавасць.

Арганізавана пачаць марксісцка-ленінскую вучобу

2 кастрычніка пачынаецца новы навучальны год у сістэме партыйнай асветы. З новымі сіламі пасля летняга перапынку работнікі мастацтва і літаратуры возьмуцца за далейшае вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі, за паглыбленне ведаў, набытых у мінулым годзе.

Значна пашыраецца сетка палітшкол і гурткоў па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і біяграфій вялікіх правадыроў совецкага народа і большэвіцкай партыі В. І. Леніна і І. В. Сталіна. У сетку партыйнай вучобы ўключаюцца не толькі комуністы, але і шматлікая армія беспартыйных работнікаў.

Павышэнне свайго ідэйна-палітычнага і культурнага ўзроўню стала штодзённай неабходнасцю нашых пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, актораў. Таму зусім заканамерным з'яўляецца той факт, што з кожным годам павялічваецца колькасць работнікаў, ахопленых марксісцка-ленінскай вучобай. Намнога палепшылася і якасць партыйнай асветы, падрыхтаванасць кіраўнікоў гурткоў і груп, метады работы. Усё гэта безумоўна спрыяла далейшаму ідэйна-палітычнаму росту дзеячоў літаратуры і мастацтва, павышэнню іх дзелавых і творчых якасцей.

Аднак, як паказалі вынікі мінулага вучэбнага года, у сістэме партыйнай асветы былі і значныя непаладкі. Іх можна было-б лёгка пазбегнуць, калі-б асобныя бюро партыйных арганізацый аддалі ў сваёй штодзённай рабоце справе вучобы комуністаў і беспартыйных значна больш увагі. Факты гавораць, што там, дзе адсутнічала сістэматычная вучоба комуністаў і беспартыйных, там знаходзілі месца праявы самазаспакоенасці, зазнайства з боку асобных работнікаў, там усталёўваліся нецярпімыя адносіны да крытыкі і самакрытыкі. Мінскі гарком КП(б) Беларусі зусім правільна і своечасова ўказаў бюро партарганізацыі Саюза совецкіх мастакоў БССР, што яно не забяспечыла разгортвання ў сваім калектыве кваліфікаванай прафесійнай крытыкі, у выніку чаго крытычныя заўвагі па карцінах асобных мастакоў успрымаліся імі няправільна, выклікалі качуццё крыўды і прыводзілі да ненармальных узаемаадносін паміж членамі Саюза. Адсутнасць адпаведнай марксісцка-ленінскай падрыхтоўкі прывяла асобных мастакоў да напісання безыдэйных, апалітычных карцін, а ў радзе выпадкаў да скажэння вобразаў совецкіх людзей (карціны «Штаб Мінскага партызанскага злучэння» М. Гусева; «Разгром нямецкіх груп пад Мінскам» А. Волкава, «Злавілі» В. Ціхановіча і інш.).

Недастатковым ідэйна-тэарэтычным выхаваннем работнікаў тлумачацца і тыя сур'ёзныя недахопы, што маюць месца ў рабоце Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Тэатральны калектыў дрэнна працуе над стварэннем і пастаноўкай беларускіх опер. У тэатры слаба займаюцца пытаннем творчага росту і выхавання акторскай моладзі, а партыйная арганізацыя цярпіма адносіцца да няправільных паводзін асобных вядучых актораў, якія стрымліваюць творчы рост і вылучэнне маладых кадраў.

Значныя недахопы ў справе марксісцка-ленінскай вучобы мелі месца і ў партыйнай арганізацыі кіностудыі «Беларусьфільм». Доўгі час тут дрэнна працаваў агіткаляктыў, адсутнічала сістэматычная работа над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню ў тых таварышаў, якія самастойна вывучалі творы класікаў марксізма-ленінізма. Мелі месца такія выпадкі, калі асобныя комуністы, якія вучыліся ў вячэрнім Універсітэце марксізма-ленінізма, не здавалі экзаменаў. Адсюль зразумелы і тыя недахопы, якія ёсць у рабоце кіностудыі: невысокая якасць кінохронікі, дрэнная работа са сцэнарыстамі, вельмі абмежаваная колькасць выпуску мастацкіх фільмаў, адсутнасць дзелавой абстаноўкі.

Сярод асобных работнікаў часамі можна пачуць такую размову: «Што мне практычна дасць веданне тэарэтычных палажэнняў і вываду?». Гэтыя таварышы не разумеюць аднаго, што марксісцка-ленінскае вучэнне — навука навук, і веданне яго — абавязковая ўмова росту кожнага работніка літаратуры і мастацтва, які хоча стаяць на ўзроўні задач дня і паспяхова працаваць у абранай ім галіне дзейнасці.

«Авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй зусім не значыць—завучыць усе яе формулы і вывады і чапляцца за кожную літару гэтых формул і вываду. Каб авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй, трэба, перш за ўсё, навучыцца адрозніваць паміж яе літарай і сутнасцю.

Авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй—значыць засвоіць **сутнасць** гэтай тэорыі і навучыцца карыстацца гэтай тэорыяй пры вырашэнні практычных пытанняў рэволюцыйнага руху ў розных умовах класавай барацьбы пролетарыята.

Марксісцка-ленінская тэорыя ёсць не догма, а кіраўніцтва к дзеянню» (Гісторыя Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў). Кароткі курс).

Да пачатку вучобы ў сетцы партыйнай асветы засталося вельмі мала часу. Партыйныя арганізацыі творчых саюзаў, тэатраў, Кіраўніцтва па справах мастацтва, Міністэрства кінематаграфіі, Камітэта па справах культурна-асветных устаноў, кіностудыі «Беларусьфільм» павінны яшчэ раз праверыць, ці ўсе работнікі іх устаноў ахоплены марксісцка-ленінскай вучобай. Неабходна пазбегнуць памылак мінулага года, калі ў асобных установах (Міністэрства кінематаграфіі БССР) многія беспартыйныя таварышы не займаліся павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню, не вывучалі гісторыі нашай партыі, твораў Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Яшчэ ёсць час удакладніць спісы груп палітшкол, гурткоў, спісы таварышаў, якія самастойна вывучаюць творы марксізма-ленінізма. Бюро партарганізацый асаблівую ўвагу павінны звярнуць на падбор і вылучэнне высокакваліфікаваных кіраўнікоў гурткоў, семінараў, палітшкол, гурткоў па вывучэнню біяграфій В. І. Леніна і І. В. Сталіна.

Партыйныя арганізацыі ўжо цяпер павінны паклапаціцца і аб вучэбных дапаможніках, і аб памяшканні для вучобы. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на тое, каб з першых дзён не было пропускаў заняткаў. Практыка мінулага года паказвае, што там, дзе партыйнае бюро слаба цікавіцца якасцю партыйнай вучобы, там наглядаюцца частыя пропускі і нават зрывы заняткаў, як гэта мела месца ў тэатры імя Янкі Купалы. Партбюро мірылася з такім становішчам і не прымала захадаў для ліквідацыі гэтых сур'ёзных недахопаў. Партыйнае бюро ні разу не заслухала справаздач комуністаў аб іх рабоце над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

У сувязі з ростам ідэйна-палітычнай падрыхтоўкі нашых творчых кадраў неабходна ўзняць і якасць уступных лекцый, асабліва лекцый для тых таварышаў, якія самастойна вывучаюць творы класікаў марксізма. Варта падумаць і над тым, каб арганізаваць чытанне цыкла кваліфікаваных лекцый па пытаннях марксісцка-ленінскай эстэтыкі і социялістычнага рэалізма.

Справа гонару партыйных арганізацый своечасова і арганізавана пачаць новы навучальны год.

Беларускія пісьменнікі ў барацьбе за мір

Гэтымі днямі ў канцэртнай залі Мінскага Акруговага Дома афіцэраў адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны тэме «Беларускія пісьменнікі ў барацьбе за мір».

З уступным словам выступіў народны паэт БССР Якуб Колас. Ён падкрэсліў выключнае значэнне барацьбы за мір простых людзей усяго свету і ролю совецкіх пісьменнікаў у гэтай барацьбе. Затым паэты Пятрусь Броўка, Пімен Панчанка, Пятро Глебка, Алесь Бачыла, Міхась Калачынскі, Аляксей Русецкі, Рыгор Няхай, Кастусь Кірэенка і Анатоль Вялюгін прачыталі свае вершы, прысвечаныя тэме міру і гераічнай барацьбе карэйскага народа супроць амерыканскіх захопнікаў.

У заключэнне вечара з канцэртнай праграмай, прысвечанай барацьбе за мір, выступілі артысты Белдзяржфілармоніі і тэатра імя Янкі Купалы.

Вечар, арганізаваны Саюзам совецкіх пісьменнікаў БССР і Акруговым Домам афіцэраў, прайшоў з вялікім поспехам.

Новы кінотэатр

У клубе Віцебскага абласнога будаўнічага трэста адкрыўся філіял гарадскога кінотэатра «Спартак». Тут штодзённа адбываюцца чатыры сеансы.

Гледачам паказваюцца новыя мастацкія фільмы.

Рабочыя актыўна наведваюць новы тэатр.

Песні ў абарону міру

Беларускія паэты і кампазітары напісалі цыкл песняў, якія прысвечаны тэме барацьбы за мір, супроць амерыкана-англійскіх падпальшчыкаў новай вайны.

Сваім драматызмам і глыбокай ідэйнай накіраванасцю асабліва вызначаецца вялікі хор кампазітара М. Аладава на словы Вагера «Абарона міру».

Д. Лукас яшчэ вясной напісаў цікавую харавую песню «Будзе мір» на словы М. Гамолкі, а пазней—«Марш абаронцаў міру». Кампазітар Д. Камінскі стварыў выразны, эмацыянальна багаты хор «Мірны наш шлях» на словы М. Васілька. Хор услаўляе мірную працу нашых калгаснікаў.

Добры, меладычна і гарманічна свежы хор «Мір пераможа вайну» (словы А. Бачылы) стварыў Р. Пукст. Сваім гучаннем, энергічнай рытмікай і характэрнымі меладычнымі зваротамі гэты хор пераклікаецца з антыфашысцкімі маладзёжнымі песнямі.

Арыгінальныя і самабытныя харавыя песні стварылі маладыя кампазітары Кузняцоў—«Мір свету» (словы К. Пуроўскага) і Абеліёвіч — «Песня міру» (на тэкст П. Барэйкі).

Над новымі песнямі на тэксты беларускіх паэтаў працуюць таксама кампазітары В. Яфімаў, Ул. Алоўнікаў, П. Падкавыраў. Кампазітар А. Багатыроў распачаў працу над вялікай кантатай «За мір» на тэксты беларускіх паэтаў — для хора, салістаў і беларускага народнага аркестра.

Песні міру—адна з асноўных тэм не толькі кампазітараў прафесіяналаў, але і пачынаючых аўтараў. Так, кампазітар Р. Галавасцікаў (Баранавічы) стварыў вельмі цікавую песню на ўласны тэкст. На тэмы міру напісалі песні перыферыйныя кампазітары: Н. Ларкоў (Палеская вобласць), Псароў (Пінск), В. Дробан (Пінск), В. Багатава (Бабруйск) і інш.

Большая частка твораў ужо выконваецца хорам Беларускага камітэта радыёінфармацыі (хормайстра Р. Пукст), а некаторыя з іх—хоры Камінскага, Кузняцова, Лукаса, Пукста і Цікоцкага — запісаны на тонфільм.

Беларускія кампазітары, адгукаючыся на важнейшыя падзеі жыцця, ствараюць не толькі песні аб міры. Справай гонару нашых кампазітараў з'яўляецца стварэнне змястоўных і цікавых масавых песень аб социялістычнай Радзіме, аб Совецкай Арміі і яе геніяльным палкаводцы — вялікім Сталіне, аб Героях Совецкага Саюза і Социялістычнай Працы, аб нашай моладзі, аб калгасным будаўніцтве, аб вялікіх справах совецкіх людзей, аб краінах народнай дэмакратыі.

Я. ЦІКОЦКІ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

Эстонскі мужчынскі хор
(Да гастроляў у Мінску)

Харавое спяванне а-капела—адна з найбольш даўніх і распаўсюджаных у Эстонскай ССР форм народнага мастацтва. Узнікненне яго адносіцца да пачатку 19-га стагоддзя. З устанаўленнем у Эстоніі совецкай улады харавое спяванне стала сапраўды народным мастацтвам. Свята песні ў 1947 і ў асаблівасці 1950 г. ператварылася ва ўсенароднае свята, якое адлюстравала бязмежную адданасць эстонскага народа сваёй социялістычнай Радзіме, партыі і вялікаму Сталіну.

Стварэнне прафесійнага харавога калектыва стала магчымым толькі ў Совецкай Эстоніі, дзякуючы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы, якая забяспечыла росквіт мастацтва, нацыянальнага па форме і социялістычнага па зместу.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў горадзе Яраслаўлі былі арганізаваны дзяржаўныя мастацкія ансамблі Эстонскай ССР, у склад якіх уваходзілі таксама змешаны і мужчынскі хоры.

Пасля вызвалення тэрыторыі Совецкай Эстоніі ад фашысцкіх акупантаў, у 1944 годзе, у рэспубліку звярнуліся таксама дзяржаўныя мастацкія ансамблі. Улічваючы, што мужчынскі хор з 30 чалавек з'яўляецца вельмі малым канцэртным ансамблем, Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў Эстонскай ССР прыняло рашэнне прыступіць да арганізацыі каляктыва з 80 чалавек. Ажыццявіў гэтую задачу прафесар Густаў Эрнесакс, які стаў на чале хора як дырыжор, выконваючы адначасова функцыі мастацкага кіраўніка.

Дзяржаўны мужчынскі хор Дзяржфілармоніі Эстонскай ССР ставіць перад сабой задачу пазнаёміць працоўных братніх рэспублік з эстонскай песеннай культурай. У рэпертуары дзяржаўнага мужчынскага хора — харавая творчасць рускіх, замежных і эстонскіх музычных класікаў, сучасная харавая творчасць братніх народаў, у тым ліку эстонскага народа, і рускія, украінскія, грузінскія, латышскія, літоўскія, эстонскія і іншыя народныя песні.

Р. ІВАЛА.

Выстаўка балгарскага выяўленчага мастацтва

У Маскве, у парку культуры і адпачынку імя Горкага, адкрылася выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі і культуры Балгарыі. Значнае месца на выстаўцы адведзена лепшым творам рэалістычнага мастацтва.

Шырока экспанавана народная творчасць: вядомыя балгарскія вышыўкі, цудоўная кераміка, прыгожыя дываны.

Новае балгарскае мастацтва вельмі маладое, хоць балгарскі народ мае адну з самых старажытных славянскіх культур. Адраджэнне нацыянальнай мастацкай культуры пачынаецца ў другой палове мінулага стагоддзя. Яно шчыльна звязана з рэволюцыйным уздымам 60-х гадоў у Расіі. Станіслаў Даспеўскі (1826—1876 г. г.), Нікалай Паўловіч (1825 — 1896 г. г.), Хрыста Докеў (1883 г.), якія вучыліся ў рускіх акадэміях, сцвердзілі свецкі кірунак у новым балгарскім выяўленчым мастацтве.

Гэты новы кірунак вызначаецца, перш за ўсё, цікавасцю да чалавека, што знайшло выяўленне ў росквіце партрэтнага жанра.

Нікалай Паўловіч і Станіслаў Даспеўскі малявалі прадстаўнікоў нацыянальнага адраджэння. У іх творчасці адчуваецца зацікаўленасць да ўнутранага жыцця чалавека, да яго псіхалогіі.

Асабліва цікавы ў гэтых адносінах партрэт жонкі мастака Даспеўскага (1869 г.). Выхаванец Пецярбургскай Акадэміі мастацтва Даспеўскі шчыльна звязаны з нацыянальна-вызваленчым рухам.

Партрэтны жанр хутка развіваецца ў канцы XIX і пачатку XX стагоддзяў у творчасці раду таленавітых балгарскіх мастакоў.

Работы названых мастакоў — гэта галоўным чынам партрэты перадавых людзей Балгарыі, дзеячоў навукі, літаратуры і мастацтва. Жыццёва праўдзівыя і выразныя партрэты сведчаць аб глыбокім гуманізме балгарскага мастацтва.

Варта адзначыць «Партрэт маёй маці» мастака Цено Тодарава. Звяртае ўвагу сваёй жыццёвай праўдзівасцю партрэт балгарскага гісторыка Стаяна Заімава, намаляваны мастаком Іванам Мырквічкам (1856—1938 г. г.). Строгай прастатой жывапіснай гамы, высакароднасцю вызначаецца партрэт паэтэсы Доры Габе—работа Стэфана Іванова. Дакладнасць малюнка, ідэальная чыстата ліній—характэрныя рысы творчасці гэтага мастака.

Глыбокай адухоўленасцю вызначаюцца партрэты мастака Міколы Міхайлава. Асабліва гэта датычыцца партрэта пісьменнікаў П. Ю. Тодарава і Івана Вазава.

Буйны прадстаўнік батальнага жанру ў балгарскім мастацтве — Яраслаў Вешын (1859 — 1915 г. г.). На выстаўцы прадстаўлены яго невялікія, але цудоўныя па жывапісу карціны з народнага жыцця «Зімой на кірмашы» і «Гайдукі». У апошняй мастак паказвае ўдзельнікаў народна-вызваленчага руху, якія пакіроўваюцца ў горы.

Адна з вялікіх карцін Вешына «Перамога балгарскіх войск над туркамі пры Люле-Бургасе» прысвечана Балканскай вайне 1912—13 г. г. На фоне бязмежна шырокага пяйзажа размытых снежных палёў паказаны рэшткі ўцякаючай турэцкай арміі. Змрочны каларыт карціны замацоўвае ўражанне ад разгрому турэцкай арміі.

У жанравым жывапісу пераважаюць пяйзажы роднай краіны. Па сваёй маляўнічасці і тыповасці найбольшую цікавасць уяўляюць карціны «Кірмаш» і «Продаж свіней» мастака Антона Мітава (1862—1892 г. г.). Змястоўная карціна Івана Мырквічкі «Ручаніца» (1894 г.). У карціне «Бежанцы з Фракіі» паказаны эпізод з жыцця шматпакутнага народа паўднёвай Балгарыі, на якую туркі часта рабілі набегі. Сцэна з народнага жыцця ў карціне набыла ў трактоўцы мастака сацыяльную завостранасць. Гэтая рыса паказвае на шчыльную сувязь перадавога балгарскага мастацтва з традыцыямі рускага крытычнага рэалізма.

Пяйзажны жывапіс на выстаўцы прадстаўлены палотнамі Міхава, Мутафава, Ст. Станчава.

Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю балгарскага народа ў перыяд паміж першай і другой сусветнымі войнамі, калі антынародны ўрад ператварыў Балгарыю ў прыслужніцу германскага фашызма. Аднак вольналюбівы балгарскі народ не скарыўся перад ворагам. Асноўная група мастакоў, поўная пачуцця любві да Радзімы і імкнення захаваць родную культуру, застаецца вернай традыцыям народна-дэмакратычнага мастацтва. Гэта — пляяда сучасных балгарскіх мастакоў-рэалістаў, творчасць якіх прадстаўлена на выстаўцы партрэтамі аднаго з заснавальнікаў балгарскага тэатра — народнага артыста Івана Папова (мастак П. Пятроў), артыста Крыстю Сарафава ў ролі Фальстафа, галоўнага рэжысёра Сафійскага тэатра Масаліціна і інш.

Мастакі гэтага пакалення працуюць над хвалюючымі тэмамі сучаснасці. Карціна Ільі Пятрова «Партызаны», якая экспанавана на выстаўцы, прысвечана падзеям гераічнай барацьбы балгарскага народа з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Аднак яе пераканальнасці шкодзяць некаторыя фармалістычныя прыёмы.

Пераадольваючы элементы фармалізма ў сваёй творчасці, мастак Балканскі стварыў цікавую карціну «Сям'я». Яна хвалюе глыбінёй шчырага пачуцця, сур'ёзнасцю ў вырашэнні тэмы аб лёсе працоўных у капіталістычных краінах. Паказаны муж, жонка з грудным дзіцем на руках. Муж, павярнуўшыся спіной да гледача, глядзіць праз акно на трубы фабрык і заводаў, і вы адчуваеце пакутлівае пачуццё чалавека, які не знаходзіць магчымасці для прымянення сваёй энергіі, сваіх моцных рабочых рук.

У творах мастакоў адлюстраваны і побыт балгарскай вёскі. Карціна «Ніва» Хрыста Станчава паказвае цяжкае жыццё працоўных сялян да вызвалення іх Совецкай Арміяй. Змястоўная карціна «Малацьба» — аб новай вёсцы ў дэмакратычнай Балгарыі, напісаная маладым мастаком Панаётавым.

Пачэснае месца на выстаўцы займаюць партрэты правадыроў балгарскага народа. Цікавы партрэт Георгія Дзімітрава мастака Барыса Мітава. Жыццёвая праўдзівасць і значнасць вобраза спалучаюцца з прадуманай каларыстычнай гамай. Партрэт адзначаны Дзімітраўскай прэміяй.

Мастак Гюджэнаў у партрэце таварыша Сталіна паказаў невычарпальную ўнутраную сілу і энергію найвялікшага чалавека эпохі, правадыра ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва і сцяганосца міру. З вялікай цеплынёй працаваў малады мастак Донкаў над станкавай скульптурай, якая паказвае таварыша Сталіна. Ва ўсіх карцінах і скульптурах, якія прысвечаны таварышу Сталіну, адчуваецца глыбокая шчырасць і сардэчная любоў балгарскага народа да свайго вызваліцеля.

У скульптурным раздзеле таксама змешчаны добрыя партрэты В. І. Леніна і маршала Талбухіна — мастака К. Тодарава.

Звяртае на сябе ўвагу скульптурная група мастака Куцарава «Партызаны». Цікавая група Лазарава «Сяляне смяюцца».

Асабліва змястоўныя работы таленавітага скульптара Івана Фунева. У барэльефе «Трэці клас», нягледзячы на некаторую экспрэсіяністычнасць прыёму, мастак стварыў тыповыя народныя вобразы. У гэтым жанравым рэалістычным матыве ёсць нават сімволіка. Народ, якому душна, ірвецца да свежага паветра, да свабоды.

Глядач не зможа прайсці абыякава і міма скульптурнага партрэта Нікалая Хралкова, які каля пятнаццаці год знаходзіўся ў турме і дачасна памёр. Гэтая работа Фунява была адзначана Дзімітраўскай прэміяй.

З графікі найбольш вызначаюцца работы Бешкава, які даў рад сатырычных і карыкатурных малюнкаў. Асабліва выразная карыкатура пад назвай «Блакада».

Выстаўка балгарскага мастацтва выклікае глыбокую пашану да цудоўнай краіны, да яе шматпакутнага народа, які пранёс праз стагоддзі сваю нацыянальную культуру і з дапамогай вялікага Совецкага Саюза вышаў на шырокі светлы шлях будаўніцтва социялізма.

В. ТАЛСТАЯ,
старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнай Трацякоўскай галярэі.

г. Масква.

Партыйная вучоба мастакоў

У Саюзе совецкіх мастакоў БССР у мінулым годзе сеткай палітычнай асветы была ахоплена пераважная большасць членаў Саюза, а таксама работнікаў апарата і мастацка-вытворчых майстэрняў. Некаторыя мастакі займаліся на дзённым і вячэрнім аддзяленнях Універсітэта марксізма-ленінізма пры гаркоме КП(б)Б. Пры Саюзе мастакоў працаваў гурток па вывучэнню гісторыі ВКП(б) і група, якая самастойна вывучала творы класікаў марксізма-ленінізма, а пры цэнтральных мастацка-афарміцельскіх майстэрнях — гурток па вывучэнню біяграфіі таварыша Сталіна. Мастакі з абласцей займаліся ў сетцы палітасветы пры тэрытарыяльных партыйных арганізацыях.

Тыя мастакі, якія сур'ёзна адносіліся да вучобы і сістэматычна працавалі над сабой, паказалі добрыя вынікі на экзаменах ва Універсітэце марксізма-ленінізма. Да іх адносяцца таварышы Гаўрыленка, Красоўскі, Лі, Гусеў і інш. Яны атрымалі добрыя адзнакі на экзаменах.

Падагульняючыя заняткі гуртка па вывучэнню гісторыі ВКП(б) і групы, якая самастойна вывучала творы класікаў марксізма-ленінізма, паказалі, што комуністы Бембель, Селіханаў, Палер, Прахарэвіч і беспартыйныя Раманоўскі, Кіпніс, Дучыц таксама добра засвоілі пройдзены матэрыял і паказалі добрыя вынікі ў вывучэнні марксісцка-ленінскай тэорыі.

Горш справа абстаяла ў гуртку пры цэнтральных мастацка - афарміцельскіх майстэрнях (прапагандыст тав. Манасзон). Кіраўнік гуртка абмежаваўся чытаннем і пераказам біяграфіі таварыша Сталіна, без вывучэння дадатковага матэрыяла.

Павышэнне палітычнай свядомасці мастакоў спрыяла разгортванню дзелавой і прынцыповай крытыкі і самакрытыкі пры вырашэнні творчых і арганізацыйных пытанняў у жыцці Саюза. Мастакі таксама актыўна ўдзельнічалі ў рабоце насценнага друку, выступаючы з крытычнымі матэрыяламі, накіраванымі на палепшанне нашай работы.

У перыяд перадвыбарчай кампаніі і ў час выбараў у Вярхоўны Совет СССР мастакі прымалі актыўны ўдзел у рабоце выбарчых участкаў. Яны дапамаглі ў афарміленні 33-х выбарчых участкаў горада і ў наладжванні там наглядна-агітацыйнай работы.

Разам з тым, трэба адзначыць, што ў рабоце па палітычнаму выхаванню мастакоў былі недахопы.

Указанні Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі і рашэнні бюро Мінскага гаркома КП(б)Б дапамаглі нам ускрыць нашы недахопы і палепшыць работу як партарганізацыі, так і праўлення Саюза мастакоў БССР.

Найбольш значным недахопам у нашай рабоце быў няпоўны ахоп членаў саюза палітычнай асветай. Мастакі Б. Малкін, Е. Ціхановіч, В. Ціхановіч, Тычына, Давідовіч і інш. недаацэньвалі неабходнасць павышэння свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню і бескланотна адносіліся да палітычнай вучобы, а такія мастакі, як Сухаверхаў і Козак, прыступіўшы да заняткаў ва Універсітэце марксізма-ленінізма, праз некаторы час спынілі сваю вучобу.

У групе, якая самастойна вывучала тэорыю марксізма-ленінізма, недастаткова працавалі над сабой Я. Зайцаў і З. Азгур. На палітзанятках недастаткова ўвязваліся тэарэтычныя пытанні з творчай практыкай мастакоў. Не праводзіліся таксама ўступныя лекцыі для тых мастакоў, якія самастойна вывучалі творы класікаў марксізма-ленінізма, а слухачы недастаткова выкарыстоўвалі кансультанта.

Партыйная арганізацыя абмеркавала вынікі навучальнага года ў сетцы палітасветы і намеціла канкрэтныя мерапрыемствы па палепшанню работы ў новым навучальным годзе. Перагледжаны і ўмацаваны склад прапагандысцкіх кадраў, частка якіх летам прайшла перападрыхтоўку на курсах. Больш дыферэнцыравана мы падыйшлі да ўкамплектавання гурткоў слухачамі. У новым навучальным годзе ў вячэрнім Універсітэце марксізма-ленінізма будзе займацца 20 мастакоў, у той час як у мінулым годзе займалася ўсяго 12 чалавек. У гуртку па вывучэнню гісторыі партыі будзе займацца 28 чалавек. Праўленне Саюза мастакоў набыло значную колькасць марксісцка-ленінскай літаратуры для ўдзельнікаў гурткоў. Намечаны таксама спецыяльныя заняткі, прысвечаныя складанню канспектаў. Апрача таго, намечаны рад творчых мерапрыемстваў, якія будуць спрыяць значнаму павышэнню ідэйна-палітычнага ўзроўню беларускіх мастакоў. Дастаткова адзначыць, што нашы мастакі, скульптары і графікі цяпер актыўна працуюць над творамі, прысвечанымі барацьбе за мір, супроць падпальшчыкаў вайны.

Партыйная арганізацыя і праўленне Саюза мастакоў накіроўваюць усе свае намаганні на пераадоленне недахопаў мінулага навучальнага года ў сістэме палітасветы з той мэтай, каб з пачатку новага навучальнага года дамагчыся сістэматычнай работы мастакоў над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

Н. ТУРОЎНІКАЎ.

Нашчадкі вялікіх традыцый

◆

Нікалай АСАНАЎ

◆

I.

Не толькі старыя жыхары Мінска, якія вяртаюцца ў родны горад, не пазнаюць яго, але і тыя, хто будуе гэты новы горад, самі часам са здзіўленнем спыняюцца сярод вуліц, углядаючыся ў перспяктывы новых дамоў і заводскіх карпусоў, як быццам упершыню яны бачаць тое, што зроблена іхнімі рукамі.

Хто-ж яны, гэтыя будаўнікі і стваральнікі новага, творцы цудоўных машын, усяго таго багацця, што нядаўна адкрылася перад намі на рэспубліканскай прамысловай выстаўцы?

Гэта пераважна маладыя рабочыя, якімі кіруюць вопытныя інжынеры і майстры, прычым моладзь гэта толькі нядаўна сышла са школьнай парты, і тым больш радасна за іх поспехі, за іх майстэрства, якое дае права назваць іх маладыя рукі залатымі.

Але ў гэтых маладых рабочых былі вялікія настаўнікі—партыя і рабочы клас усяго Совецкага Саюза,—вось дзе неабходна шукаць радаслоўную маладых стаханаўцаў Беларусі. Яны з вялікай настойлівасцю і любоўю прынялі ў свае маладыя рукі ўсё багацце традыцый, умельства і вопыту, што былі перададзены ім у спадчыну будаўнікамі і стваральнікамі нашай совецкай індустрыі. Гэтыя маладыя людзі вучыліся і праходзілі практыку ў цэхах Сталінградскага трактарнага і Горкаўскага аўтамабільнага заводаў. Яны вывучылі вопыт Аляксея Стаханава і метад інжынера Фёдара Кавалёва. І сама іх маладосць стала зарукай таму, што ўсё адсталае і старое не перашкодзіць ім, не знойдзе месца ў іх сэрцах. І магчыма толькі таму, што тут на кожным кроку бачыш маладосць і прагнае імкненне да ведаў,—таму асабліва ярка адчуваеш пачуццё набліжэння да вялікай і цудоўнай будучыні, якая называецца комунізмам. І ў той-жа час з незвычайнай пераканальнасцю бачыш, як наша праца набывае новыя рысы, якасныя адрозненні і прыкметы, якія з незвычайнай сілай расквітнеюць пры комунізме.

II.

Я думаю, што Фёдар Лукіч Кавалёў, дырэктар Мыцішчынскай тонкасуконнай фабрыкі, ініцыятар новага навукова абагуленага метада працы, калі-небудзь наведае Мінск, куды яго з такой гасціннасцю запрашаюць і стаханаўцы тонкасуконнага камбіната, і трактарабудаўнікі, і аўтазаводцы. І, прыехаўшы сюды, ён, напэўна, з радасцю пабачыць, як горача і шырока прыняты яго метад, як тысячы рабочых заняты пошукамі новых рацыянальных прыёмаў работы, каб стаць у адзін рад з лепшымі стаханаўцамі Совецкага Саюза. І, магчыма, іменна маладосць і адчуванне велічы сваёй стваральнай працы дапамагаюць мінчанам так лёгка і глыбока ўспрымаць усё новае і ператвараць яго ў метад сваёй працы. А калі і бываюць там-сям спробы адмежавацца ад новага, то на такіх людзей тут глядзяць са знявагай і вясёлай усмешкай.

Паслядоўнікі Кавалёва працуюць на ўсіх прадпрыемствах краіны. І атрымалася, што тая тактыка і тэхналогія, якую Ф. Кавалёў распрацаваў ва ўмовах тэкстыльнай вытворчасці, з поспехам можа быць перанята на ўсіх прадпрыемствах: у аўтатрактарнай прамысловасці, у металургічнай, на транспарце, — амаль усюды, дзе ручная праца спалучаецца з машыннай і дзе ад скарачэння часу, які ідзе на ручныя апярацыі, павышаецца так званы машынны час, які ідзе непасрэдна на вытворчасць прадукцыі.

Усё вялікае простае!—толькі так можна было-б растлумачыць выключнае распаўсюджванне першага вопыту Аляксея Стаханава—вопыту, які стаў цяпер метадам працы ў маштабах поўсвета. Я не памылюся, калі скажу, што метад Кавалёва распаўсюджваецца з такой-жа хуткасцю і шырынёй, толькі можа з той розніцай, што цяпер і рабочы стаў другім і ў распаўсюджванні гэтага метаду аднолькавая заслуга як рабочых, так і інжынераў. У новым руху асабліва яскрава відаць, як знішчаюцца апошнія грані паміж разумовай і фізічнай працай.

III.

Новае пранікала на мінскія прадпрыемствы ўсімі шляхамі. Сказана «гані прыроду ў дзверы, яна ўвойдзе ў акно!» Так адбылося і з метадам Фёдара Лукіча Кавалёва.

Першым аб гэтым метадзе загаварыў галоўны інжынер тонкасуконнага камбіната Сяргей Васільевіч Іваноў. Ён некалі працаваў разам з Кавалёвым і, так сказаць, прысутнічаў пры самым нараджэнні гэтага метаду. Вось чаму, калі на новым камбінаце шукалі лепшыя прыёмы работы, Сяргей Васільевіч Іваноў не толькі ўспомніў метад Кавалёва, але і дамогся яго прымянення. І ў 1949 годзе на тонкасуконным пачалі навучаць маладых рабочых не проста стаханаўскім метадам працы, а іменна навукова абгрунтаваным, праверaным, як і раіў Фёдар Лукіч Кавалёў.

У тэкстыльнай вытворчасці дзве асноўныя прафесіі—прадзільшчыцы і ткачыхі. Таму рабочых прыёмаў на прадзільных і ткацкіх машынах абмежаваная колькасць. Аднак ужо ў 1949 годзе на тонкасуконным усе гэтыя прыёмы былі прахранаметраваны, сфатаграфаваны, і лепшыя стаханаўцы—такія, як прадзільшчыцы Людміла Міхайлаўна Манькоўская, Людміла Цвірко, Хіма Бурмістрава,—і ткачыхі—Ольга Войніч, Ольга Сумарава, Ганна Дубянкова да пачатку гэтага года былі ўжо інструктарамі стаханаўскіх метадаў.

І таму, што яны вучылі маладых прадзільшчыц і ткачых, у асноўным прыёмам імі самімі апрацаваным, то і не дзіўна, што на прадзільных машынах і на ткацкіх станках цяпер няма ніводнай работніцы, якая-б не авалодала гэтымі прыёмамі. Як вынік усяго гэтага—і прадукцыя і зарплата работніц значна павысіліся.

Цікава, што на гэтым маладым камбінаце ўзрост брыгадзіраў і работніц аднолькавы: 20—25 год. Адна з найбольш паважаных стаханавак камбіната Людміла Міхайлаўна Манькоўская, дваццацігадовая дзяўчына, першай пачала вышукваць і выпрацоўваць найбольш рацыянальныя прыёмы прадзення. Ёй дапамагала інжынер Валянціна Аляксандраўна Арнольд.

З ручных апярацый на прадзільнай машыне пераменнага дзеяння найбольш складаныя тры: змена бабін, змена шнура і так званае зняццё «з'ёма», г. зн. замена пачаткаў гатовай прадукцыі пустымі для прадаўжэння работы.

Бачыў я Манькоўскую за працай: яна стаіць каля вінта вялікай машыны, карэтка якой, адсоўваючыся ад бруса, сцягвае з бабін адначасова 360 нітак, прымацаваных да верацён на карэтцы. Верацёны, верцячыся, закручваюць ніткі, потым карэтка рухаецца назад да брусоў, і верацёны накручваюць ніткі на пачаткі. У выпадку абрыву ніткі яе прысучваюць на хаду машыны, прыёмам Хімы Бурмістравай. Фатаграфія гэтага прыёму і лістоўка з апісаннем яго вісяць у цаху, як фатаграфіі ўсіх іншых рацыянальных прыёмаў. Змена бабін раней займала 95 сякунд, цяпер гэта робіцца за 74 сякунды. На зняцце гатовых пачаткаў раней патрабавалася 480 сякунд, а цяпер—302. Змена шнура, які круціць верацяно, замест 40 сякунд праводзіцца за 30.

Гэты ўлік сякунд значна павысіў культуру працы і прывёў да таго, што кожны работнік адчувае і ведае дакладную пану свайму часу. І калі якая-небудзь з работніц знаходзіць нешта новае, што зменшае апярацыю яшчэ на некалькі сякунд, яна адразу-ж паведамляе свой новы спосаб брыгадзіру, інструктару і інжынеру. Калі-ж прыём праверaны і ўдакладнены, яна паказвае яго ў стаханаўскай школе. А на наступны дзень ім авалодваюць ужо ўсе таварышы па прафесіі. Так ажыццяўляецца на тонкасуконным метад Ф. Кавалёва.

IV.

Большасць рабочых, з якімі я гутарыў аб распаўсюджванні метаду Ф. Кавалёва, прызнаюць, што іменна ён атрымае шырокае распаўсюджванне, і ўсяляк дапамагаюць гэтаму распаўсюджванню.

Аднак у цяжкой прамысловасці, дзе колькасць ручных і машынных апярацый значна большая, яны не могуць быць зведзены да 5—10 прасцейшых прыёмаў, як гэтага дамагаюцца тэкстыльшчыкі, тут яшчэ можна пачуць пярэчанні. Пярэчанні гэтыя зводзяцца па сутнасці да двух пунктаў: колькасці і разнастайнасці апярацый, і—складанасці ўліку машыннага часу, бо многія токары, фрэзяроўшчыкі, кавалі апрацоўваюць дэталі на станку так доўга, што трата часу на ручныя апярацыі па сутнасці ператвараецца ў нязначныя надбаўкі. Вазьміце, гавораць гэтыя скептыкі, токара, які апрацоўвае каленчаты вал. Апрацоўка такога вала на станку займае шмат часу, а ручныя апярацыі — пастаноўка дэталі, падвод супарта, уключэнне станка—вылічваюцца сякундамі. Чым-жа тут дапаможа метад Кавалёва?

Гэтым скептыкам прасцей за ўсё было-б паглядзець, як метад Кавалёва распаўсюджваецца на трактарным заводзе.

Калі токары цэха пускавых матораў трактарнага завода Анатоль Цузой і Іван Мальцаў даведаліся аб метадзе інжынера Кавалёва, ім таксама здалося, што непасрэдных адносін да іх такарнай справы гэта пачынанне не мае. І адзін і другі прышлі ў цэх з школы ФЗН: Цузой у канцы 1949, а Мальцаў у студзені 1950 г. Цузой апрацоўваў махавік пускавога рухавіка для дызельных трактараў, а Мальцаў—шчаку каленчатага вала гэтага рухавіка. У першага зменшчыкам быў Яўгені Пашкевіч, у другога—Калацілаў. Усім чатыром ім ад сілы было 80 год, аднак яны ўжо былі стаханаўцамі, паважанымі людзьмі, любілі наватарства, займаліся рацыяналізатарствам і ўдасканаленнем сваёй працы, а таму пачын тэкстыльшчыкаў для іх меў значную цікавасць.

Але вось у цаху з'явілася Соф'я Іванаўна Рымар, начальнік бюро працы і зарплаты, да якой рабочыя адносіліся з павагай. Яна прапанавала правесці вывучэнне прыёмаў іх працы па метаду інжынера Кавалёва, каб потым перадаць свой вопыт другім рабочым. Уласна кажучы, звярнулася яна да Мальцава і яго зменшчыка Калацілава. Анатоль Цузой быў толькі сведкам размовы.

Мальцаў выпрацоўваў у сярэднім 170 процантаў нормы. У цаху працавала амаль што адна моладзь, і ўсе цягнуліся за Мальцавым і другімі перадавікамі. Мальцаў адказаў:

— Што-ж, я згодзен, але ваш хранамятрыст хай стаіць у баку, бо на той хуткасці, на якой я тачу, стружка ідзе сярэдзітая, можа апаліць і параніць.

Сам-жа Мальцаў, вывучыўшы свой станок, абыходзіўся без ахоўнай агарожы, аднак задні бок станка быў абгароджаны лістом жалеза.

Хранамятрыст раздзяліў увесь працэс работы Мальцава на 9 розных апярацый. Мальцаў працаваў і пасмейваўся, а хранамятрыст уважліва запісваў нейкія лічбы. У наступную-ж змену той-жа самы хранамятрыст запісваў ужо работу Калацілава. Напарнікі нават падсмейваліся над новай выдумкай. Абодва яны выпрацоўвалі па 170 процантаў, і тут хранамятрыст, напэўна, ніякай розніцы не знойдзе.

Але якое іх было здзіўленне, калі Соф'я Іванаўна Рымар паведаміла ім,—ды і не толькі ім, а адразу ўсім токарам, а іх на ўчастку 22 чалавекі,—вынікі абследвання! Атрымалася, што Мальцаў на першую апярацыю—узяць дэталь, устанавіць і замацаваць—затрачвае 17,5 сякунд, а Калацілаў—25; на другую — уключыць станок, падвесці супарт—Мальцаў—8,7, а Калацілаў—12,5; на трэцюю—падрэзка торца дэталі—Мальцаў—26,6, а Калацілаў ужо менш—23; затое на чацвертай і пятай апярацыях—уключыць станок, адвесці супарт, адключыць дэталь, а затым павярнуць яе і замацаваць—Мальцаў ізноў наперадзе—31 сякунда, а Калацілаў траціць 46,3. Але самая вялікая розніца назіралася на сёмай апярацыі — падрэзка другога боку дэталі—у Мальцава 46,1, у Калацілава — 24,5. У выніку аказалася, што дэталі адточаны амаль у адзін час у абодвух — за 163 сякунды. Аднак аналіз паказаў, што ўсе ручныя апярацыі Мальцаў робіць хутчэй, а ўвесь машынны час, працэс абточкі Калацілаў выкарыстоўвае лепш.

Як тут усхваляваліся хлопцы! І не толькі Мальцаў і Калацілаў, але астатнія рабочыя цэха. Адкуль такая розніца? А ўсё адбывалася вельмі проста: Мальцаў, выконваючы ручныя апярацыі, працаваў адпачасова дзвюма рукамі, а Калацілаў праводзіў апярацыю паслядоўна. Ён напрыклад чакаў, калі станок дасць поўную хуткасць абаротаў, і толькі тады пачынаў падводзіць супарт; гэта марудзнасць каштавала 4,5 сякунды. Затое Калацілаў знімаў адразу вялікую стружку, дакладна авалодаўшы вымярэннямі пры дапамозе ноніуса—вымярыцеля на супарце станка. Мальцаў-жа асцерагаўся, а таму машынны час прападаў задарма.

На наступны-ж дзень Мальцаў выкарыстаў усе прыёмы Калацілава і даў 80 дэталяў замест 60. Калацілаў таксама пераняў прыёмы Мальцава і даў столькі-ж — 80 дэталяў. А калі-ж аказалася, што і ў другіх токараў ёсць свае добрыя прыёмы, яны выкарысталі іх і даюць цяпер па 100 дэталяў.

Цузой прышоў да Соф'і Іванаўны Рымар. Ён пажадаў, каб яго работу і работу папарніка таксама параўналі па метаду Кавалёва. І калі-ж хранамятрыст стаў каля станка Цузоя, а яго суседзі Каваленка і Галавач пачалі насміхацца: «І ты, Цузой, у стаханаўцы запісваешся? Глядзі, павялічаць нормы!» — ён адказаў, што ім прыдзецца яшчэ ў яго вучыцца рацыянальным прыёмам.

Анатоль Цузой быў токарам-хуткаснікам. Аднак першы-ж дзень праверкі падказаў яму, што неабходны больш устойлівыя разцы, і праз дзень ён даваў хуткасць рэзання замест ранейшых 108 да 270 метраў у хвіліну. Стружка з-пад яго разца ідзе чырвоная. Дэталь ён здымае пры дапамозе мокрай анучкі, вада шыпіць на ёй. Падагуліўшы вопыт і другіх токараў, Цузой дае цяпер 90 дэталей замест 50.

Але гэта было толькі пачаткам, хоць прайшло ўсяго два тыдні. Цяпер у стаханаўскіх школах трактарнага па метаду інжынера Кавалёва перавучваюцца амаль усе станочнікі. Вопыт Цузоя і Мальцава зрабіўся ўрокам для ўсяго завода.

V.

За апошнія гады мне даводзіцца часта сустракацца з перадавікамі вытворчасці. І кожны раз мяне радуе тое, з якой хуткасцю і рашучасцю гэтыя людзі ўспрымаюць усё новае.

Іменна ў гэтым, хвалюючым працэсе авалодання новым, лепш за ўсё відаць зліццё разумовай і фізічнай працы. На самай справе, калі вучоны даведваецца, што ў блізкай яму галіне ведаў нехта знайшоў новае, то ён неадкладна пачынае правяраць сваю работу па новых дадзеных. Таму, відаць, навуковыя работы Ольгі Барысаўны Лепяшынскай і Баш'яна ўжо цяпер прымушаюць многіх вучоных перагледзець свой пункт погляду і свае тэарэтычныя веды.

Тое-ж самае, але яшчэ ў большых памерах, адбываецца цяпер на ўсіх прамысловых прадпрыемствах, ва ўсіх галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Кароткая заметка ў газеце «Правда» аб метадзе Ф. Кавалёва выклікала тысячы водгукаў і пісем, а артыкул Кавалёва «Наш вопыт» стаў прадметам абмеркавання на партыйных, комсамольскіх і профсаюзных сходах.

А колькі рабочых вучыцца? На трактарным, пры ўваходзе ў цахі, вісяць плакаты: «Малады рабочы, ці выбраў ты школу, у якой будзеш вучыцца?», а побач другі: «Парайся з комсоргам цэха, ён падкажа табе, дзе займацца!».

Нават знешнія прывычкі чалавека разумовай працы — любоў да кнігі, работа за сталом, умельства начарціць схему і падлічыць яе эфектыўнасць — усё робіцца звычайным для любога рабочага.

Вось парткамітэт аўтазавода слухае і абмяркоўвае даклад брыгадзіра фрэзероўшчыкаў Фралова, які дамогся таго, што ўся яго брыгада за паўгода выканала па 16—18 месячных норм. І вопыт Фралова перадаецца астатнім рабочым. На станцыі Брэст-Цэнтральная ў пачатку верасня была праведзена нарада сакратароў партыйных і комсамольскіх арганізацый, прысвечаная метаду Кавалёва. 8-га верасня — нарада стаханаўцаў сумесна з інжынерамі і тэхнікамі. 9-га — сход інжынераў. Вынік — створана 12 стаханаўскіх школ, у якіх вучыцца 57 чалавек.

Ці варта яшчэ прыводзіць факты? Мы яскрава бачым, як наша партыя фармуе новага чалавека, з новымі адносінамі да працы, чалавека блізкай да нас эпохі комунізма.



★

Фасад новага будынка Рускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра БССР.

Фота Г. БУГАЕНКІ

★

Чаму не чутна голасу камісіі па крытыцы?

Пытанням развіцця прынцыповай большэвіцкай літаратурнай крытыкі былі прысвечаны апошнія пленумы ССП СССР і БССР, якія прайшлі ў студзені і красавіку. На пленумах і ў друку абмяркоўвалася становішча і задачы крытыкі і літаратуразнаўства, а таксама шляхі іх карэннага палепшання.

Напярэдадні пленума прэзідыум ССПБ, асудзіўшы слабую работу мінулага кіраўніцтва камісіі па крытыцы, зацвердзіў новы склад яе. У камісію ўвайшлі Я. Шарахоўскі (старшыня), Ул. Агіевіч (адказны сакратар), В. Барысенка, Ул. Карпаў, А. Есакоў, Р. Шкраба і С. Майхровіч.

Пасля змены кіраўніцтва камісіі справа не толькі не палепшылася, а, наадварот, пагоршылася. Калі раней тыя ці іншыя пытанні літаратуры і абмяркоўваліся на сходах крытыкаў, дык за апошняе паўгоддзе камісія па крытыцы зусім змоўкла і фактычна апынулася ў баку ад літаратурнага жыцця.

За час пасля пленумаў адбылося многа значных падзей, якія варты самай сур'ёзнай увагі камісіі па крытыцы.

Геніяльныя работы І. В. Сталіна аб мовазнаўстве выклікалі новы велізарны ўздым ва ўсіх галінах навукі, у тым ліку і ў галіне літаратуразнаўства. Разгортваюцца плённыя навуковыя і творчыя дыскусіі, якія ахапілі шырокія колы вучоных, літаратараў і іншых прадстаўнікоў совецкай інтэлігенцыі. Але гэтыя дыскусіі чамусьці праходзяць міма камісіі па крытыцы.

Выйшлі з друку новыя кнігі: «Партызанскі край» В. Лівенцава (літаратурная апрацоўка Р. Няхая), «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча, новая кніга Г. Шчарбатава аб партызанскім руху, зборнік «Беларускі трактарны», новыя кнігі паэзіі на беларускай і рускай мовах — П. Броўкі, П. Панчанкі, П. Глебкі, А. Вялюгіна, М. Лужаніна і інш. У часопісу «Полымя» былі змешчаны раманы «Сустрэнемся на барыкадах» П. Пестрака, «Мінскі напрамак» І. Мележа, «Згуртаванасць» М. Ткачова, п'есы К. Крапівы, В. Віткі і І. Гурскага.

Які з гэтых твораў усхваляваў і зацікавіў камісію па крытыцы?

Гэта, на жаль, невядома, таму што ніводзін з іх не быў абмеркаваны.

Крытыкі не знайшлі часу сабрацца і абмеркаваць новыя выданні падручнікаў па беларускай літаратуры.

Не зацікавілася камісія працай саміх крытыкаў, не зацікавілася і нізкім узроўнем аддзелаў крытыкі і бібліяграфіі ў рэспубліканскіх літаратурна-мастацкіх часопісах.

Не выклікае ў членаў камісіі ніякай трывогі адсутнасць у часопісах праблемных артыкулаў па пытаннях марксісцка-ленінскай эстэтыкі і сацыялістычнага рэалізма, выступленняў, якія выкрываюць буржуазную ідэалогію і распад культуры ў цэнтры сусветнай рэакцыі — ЗША і маршалізаваных краінах.

Дзіўную абыякавасць праяўляе камісія і да маўчання сваіх членаў—Я. Шарахоўскага, Ул. Агіевіча, В. Барысенкі, якія ўжо даволі працяглы час не друкуюцца. Толькі два члены камісіі—Ул. Агіевіч і С. Майхровіч актыўна ўдзельнічалі ў рэспубліканскай нарадзе маладых літаратараў.

Адзін раз за паўгоддзе сабраліся крытыкі, каб заслухаць шырокавяшчальны план работы, які, аднак, так і застаўся не выкананым.

Калі прычынай бяздзейнасці камісіі па крытыцы з'яўляецца яе няздольнасць самастойна ўзняць важнейшыя пытанні літаратуры і літаратурнай крытыкі, дык ёй у гэтым павінен дапамагчы прэзідыум ССПБ. Чым хутчэй ён гэта зробіць, тым будзе лепш.

Вялікія планы і малыя справы

Штогод кіраўніцтва Белдзяржфілармоніі складае планы амаль на 30-ці старонках. Праўда, планы гэтыя ў большасці з'яўляюцца копіяй планаў Маскоўскай і Ленінградскай філармоній. Такую-ж копію-план і абмеркаваў гэтымі днямі мастацкі совет Белдзяржфілармоніі. З дакладам выступіў мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі Я. Цікоцкі. У сваіх выступленнях прамоўцы правільна абураліся фармальным падыходам да такога вельмі важнага творчага мерапрыемства, як складанне гадавога плана работы. Рэпертуарны план Белдзяржфілармоніі, які складзены кялейна, загадзя не абмеркаваны ў каляктывах філармоніі. Кіраўніцтва філармоніі ўхілілася ад грамадскай думкі. Абмеркаванне рэпертуарнага плана на 1950—51 год ускрыла рад істотных недахопаў, якія ўласцівы не толькі рэпертуарнаму плану, але і ўсяму стылю работы гэтай музычнай установы.

Дырыжор Т. Каламійцава адзначыла, што ў новым плане па раздзеле сімфанічных канцэртаў вельмі мала прадугледжана твораў беларускіх кампазітараў.

Намеснік дырэктара Белдзяржфілармоніі К. Пуроўскі і работнік Мінскага Дома афіцэраў Анчыкаў выказалі пажаданне праводзіць канцэрты ваеннай музыкі, а таксама канцэрты з твораў украінскіх кампазітараў.

Дырыжор М. Рыўкін прапанаваў перагледзець раздзел камернай музыкі з мэтай уключэння ў яго не толькі скрыпічнага квартэта, але і квінтэтаў, вакальных ансамбляў, трыё, зрабіўшы камерныя канцэрты найбольш разнастайнымі.

Музыказнаўца Б. Смольскі адзначыў, што неабходна прадугледзець тэматыку вечароў музыкі, прысвечаных 30-годдзю Комсамола Беларусі, 30-годдзю тэатра імя Я. Купалы, 20-годдзю Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета і раду іншых дат, звязаных з беларускай культурай.

Артыст аркестра Б. Афанасьеў гаварыў аб тым, што праграмы лекцый-канцэртаў павінны таксама планавацца разам з тэматыкай, каб установы ведалі, якія неабходна выбіраць ім праграмы. Канцэрты павінны складацца ў большасці з папулярнай музыкі.

У выступленнях супрацоўнікаў філармоніі—дырыжора М. Шнейдэрмана і галоўнага адміністратара Г. Спектара заўважаліся нездаровыя настроі. Яны спрабавалі давесці, што быццам-бы не трэба сімфанічнаму аркестру нікуды выязджаць, што нібы совецкая моладзь не хоча слухаць канцэртаў музыкі. Іх выступленні—спроба апраўдаць сваю бяздзейнасць у справе прапаганды совецкай і класічнай музыкі. Яны нічога не сказалі аб няўмельстве арганізаваць канцэрты, аб дрэннай арганізацыйнай працы адміністратараў Белдзяржфілармоніі.

На мастацкім совеце было адзначана, што ў новым сязоне неабходна больш увагі звярнуць на работу музычнага універсітэта, лекторыя, больш арганізоўваць канцэртаў з твораў сучасных совецкіх кампазітараў, папулярных вечароў музыкі, праводзіць канцэрты для дзяцей, выязджаць з канцэртамі ў калгасы і г. д.

Недаравальна, што на першым пасяджанні мастацкага совета чамусьці адсутнічалі адказныя работнікі Кіраўніцтва па справах мастацтва і нават дырэктар Белдзяржфілармоніі Р. Прагін.

Новыя культурныя ўстановы ў Гомелі

Гомельскі абком КП(б)Б абмеркаваў пытанне аб ходзе выканання плана аднаўлення і развіцця гарадской гаспадаркі і добраўпарадкавання горада Гомеля ў 1950 годзе. Намечана закончыць будаўніцтва кінотэатра на 450 месц і здаць яго ў эксплаатацыю ў лістападзе 1950 г., аднавіць тэатральную частку клуба імя Леніна і здаць у эксплаатацыю да 15 снежня. Значныя сродкі выдаткоўваюцца на будаўніцтва драматычнага тэатра.

В. СЯМЕНАЎ.

г. Гомель.

Аднавіць слуцкую бэру

Беларусь—краіна садаводства. На яе тэрыторыі культывуюцца самыя разнастайныя гатункі яблыкаў, груш, вішань і іншых плодовых дрэў. Але сярод іншых гатункаў—выключную каштоўнасць мае старажытная беларуская слуцкая бэра.

З даўніх часоў яна лакалізавалася пераважна каля Слуцка, але распаўсюджвалася таксама даволі далёка на поўдзень, захад і поўнач.

Варта адзначыць той факт, што ў 1910 годзе за межы Беларусі было вывезена 14500 пудоў груш, прычым 7500 пудоў было вывезена толькі праз станцыю Старыя Дарогі. Сярод гэтай прадукцыі пераважную большасць займала слуцкая бэра.

За гады совецкай улады слуцкая бэра на тэрыторыі Беларусі атрымала яшчэ большае распаўсюджванне і, у асаблівасці, на Бабруйшчыне і Міншчыне.

Слуцкая бэра мае выключныя якасці. Яна даўгавечная. Дрэва яе дасягае вялікіх памераў. Асобныя дрэвы дажываюць да 150 і больш год, маюць таўшчыню ствала да 2-х метраў, а крону ў дыяметры да 9—9,5 метраў, нягледзячы на густую пасадку.

Сярэдні ўраджай слуцкай бэры дае 109 кг на дрэва, а максімальны ўраджай дасягае больш двухсот кілаграмаў. Бывалі выпадкі, калі асобныя дрэвы давалі па 480 кілаграмаў груш.

Аднак не толькі ў гэтым каштоўнасць слуцкай бэры. Плод яе дасягае вялікіх памераў, мае выключныя смакавыя якасці. Слуцкая бэра надзвычай устойлівая супроць грыбных захворванняў і шкоднікаў саду.

Слуцкая бэра можа і павінна адыграць выключную ролю ў развіцці калгаснага садаводства. Аднак ні Міністэрства земляробства БССР, ні калгасныя садаводы не аддалі ў пасляваенны час належнай увагі развядзенню і распаўсюджванню ў калгасных садах гэтай выключна каштоўнай культуры.

Развядзенне слуцкай бэры асаблівую каштоўнасць набывае цяпер, пасля вайны. Справа ў тым, што ў часе суровых зім і асабліва ў выніку нямецка-фашысцкай акупацыі вялікая колькасць дрэў гэтага выключнага гатунку груш была знішчана. Асобныя-ж, найбольш выносліывыя экземпляры яе там-сям яшчэ захаваліся. Няма патрэбы даводзіць, што якраз гэтыя экземпляры ўяўляюць найбольшую цікавасць для садаводства, бо яны вытрымалі суровыя зімы і маюць каштоўныя марозаўстойлівыя якасці.

Аднак да гэтага часу ніхто не паклапаціўся зрабіць улік тых дрэў слуцкай бэры, якія захаваліся пасля вайны, каб выкарыстаць іх для развядзення ў садах рэспублікі.

Праўда, Беларуская садова-агародная станцыя распачала аднаўленне і размнажэнне слуцкай бэры. Многае ў гэтым напрамку ўжо зроблена. Толькі аднаго гэтага недастаткова. Неабходна, каб Міністэрства земляробства БССР, калгасныя садаводы правялі ўлік каштоўных шматгадовых дрэў слуцкай бэры, якія захаваліся ў розных раёнах Беларусі. Улік і ахова гэтых дрэў дасць магчымасць садова-агароднай станцыі, а таксама асобным садаводам яшчэ шырэй разгарнуць работу па сялекцыі груш як па лініі вывядзення новых гатункаў шляхам гібрыдызацыі, так і па лініі клонавай сялекцыі. Шматгадовыя дрэвы слуцкай бэры, якія павінны быць выкарыстаны ў якасці матачных дрэў, уяўляюць вялікую дзяржаўную каштоўнасць. Выяўленне і захаванне такіх дрэў—важнейшая задача ўсіх энтузіястаў садаводства.

Гэтая работа набывае асабліва вялікае значэнне цяпер, у нашы дні, калі адбываецца масавае аднаўленне садоў Беларусі.

Я мяркую, што з мэтай далейшага развіцця культуры грушы ў БССР неабходна: у 1951 годзе правесці выбарачнае абследванне слуцкай бэры ў Слуцкім, Мазырскім, Брагінскім і іншых раёнах, дзе захаваліся дрэвы гэтага гатунку. Правесці інвентарызацыю ўсіх дрэў слуцкай бэры, якія даюць плады, захаваць іх і перадаць у дзяржаўны матачны фонд. Неабходна таксама пашырыць работу па заснаванню матачных пітомнікаў слуцкай бэры ў калгасах. У навукова-даследчых станцыях патрэбна шырэй разгарнуць селекцыйную работу над слуцкай бэрай.

Гэта дасць магчымасць у бліжэйшы час не толькі аднавіць найбольш папулярны і каштоўны гатунак груш—слуцкай бэры, але і ў многа разоў павялічыць грушавыя насаджэнні на ўсёй тэрыторыі рэспублікі.

Э. П. СЮБАРАВА,

старшы навуковы работнік Беларускай садова-агароднай вопытнай станцыі.

Студэнты ў калгасе

Гэтымі днямі каляктывы мастацкай самадзейнасці Мінскага фінансавага тэхнікума—хор, танцавальная група і дэкламатары—выязджалі ў падшэфны калгас «Кастрычнік» Чэрвенскага раёна Мінскай вобласці. Хор выканаў «Кантату аб Сталіне», песні «Мы — беларусы», «Аб Мінскім трактарным», «Бывайце здаровы» і інш. Танцавальная група выканала «Лявоніху», «Крыжачок» і іншыя нумары. Выкладчыкі і студэнты перадалі калгасу добрую бібліятэку, дапамаглі выпусціць насценную газету і пракансультавалі кіраўнікоў мясцовай самадзейнасці.

Рыхтуецца праграма для чарговага выезду.

Л. ФРЫД,

сакратар партарганізацыі тэхнікума.

Б. БУР'ЯН

Натхнёнае слова паэта

Здаўна палюбіў чытач лірычнага героя паэзіі Петруся Броўкі. Палюбіў за шырыню яго поглядаў, за шчырасць пачуццяў. Нястомны ў працы, вясёлы ў вольную гадзіну, сур'ёзны і ўдумлівы ў размовах пра лёс народны, ён спадабаўся тысячам і тысячам совецкіх людзей. Вабіў і вабіць да сябе гэты жыццелюб, які адкінуў дробныя пачуцці і шырока адкрыў сваё сэрца свету непакойнаму і гераічнаму, свету вялікіх ідэй нашага часу.

Няхай і верш — чорнарабочы
Ідзе ударнікам да горнаў...

Як не быць удзячным за такое вось імкненне паэта быць на пярэднім краі будоўлі, на пярэднім краі барацьбы за комунізм!

Мне трэба, каб слова
падносіла цэглу,
А вершы ў альбом
і другія напішуць.

Ці можна не паціснуць рукі чалавеку, які вось так зразумеў сваё прызначэнне, сваё месца ў страі сучаснікаў!

Гляньце, сэрца маё, —
Я прынёс яго з бою,
На агні яго можна
Мячы гартаваць.

Каго не радуе вось такое сэрца патрыёта, які шчыра і горача любіць Совецкую Радзіму!

Абвешчаныя П. Броўкам у розныя гады, гэтыя дэвізы сталі своеасаблівай прысягай паэта, прысягай усёй сваёй творчасцю дапамагаць народу «падносіць цэглу», якая ляжа ў велічны будынак комунізма.

Ці адразу дасягнуў паэт таго, да чаго імкнуўся? Не, вядома. Лірычны герой П. Броўкі быў у раннія гады і крыху залішне шумлівым, і крыху многаслоўным, і крыху павярхоўным.

Год ад году лірычны герой паэзіі П. Броўкі станавіўся больш мэтанакіраваным, больш пільным, больш удумлівым. Але гады не астудзілі жар яго душы, не неравялі яго на другія рубяжы, на рубяжы сузіральнасці. Ідэйная і творчая сталасць паэта падказвае яму шляхі напісання твораў, якія адпавядаюць высокім паэтычным запатрабаваням, і ўсё больш збліжае яго лірычнага героя з радавым чытачом.

Думы і лёс простага чалавека, які разняволены Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыяй і стаў па волі партыі Леніна—Сталіна актыўным будаўніком комунізма, адлюстраваны П. Броўкам у многіх творах. Ён адным з першых у маладой беларускай совецкай паэзіі, разам з П. Глебкам, П. Трусам і паэтамі наступных пакаленняў, здолеў глыбока асэнсаваць і змястоўна перадаць тое новае, што прынёс народу з сабой социялістычны лад. У простых словах, у праніклівым лірычным тоне, афарбаваным то суровасцю і смуткам, то жыццесцвярджальнай радасцю і аптымістычным гумарам, уславіў П. Броўка незабыўныя гады грамадзянскай вайны і аднаўлення Беларусі ў перыяд сталінскіх пяцігодак. Каштоўным здабыткам усёй совецкай літаратуры з'явіліся яго эпічныя творы аб баявых гадах грамадзянскай вайны, аб працоўных буднях совецкага народа (паэмы «Праз горы і стэп», «Цэхавыя будні», «Кацярына»). Нават назвы кніг П. Броўкі сведчаць, што яны натхнёны мощнымі ўражаннямі ад сучаснага жыцця, ад нашай барацьбы — «Гады, як шторм», «Так пачыналася маладосць», «Прыход героя», «Вясна Радзімы». Гэта кнігі 30-х гадоў. Але хіба, прачытаўшы на іх вокладках такія словы, не працягнеш да іх рукі, хіба не захочаш зноў і зноў перачытаць гэтыя ўсхваляваныя паэтычныя хронікі, якія адлюстравалі гераічныя часы нядаўняй нашай гісторыі!

Жывучы разам з родным народам, адным з ім лёсам, лірычны герой П. Броўкі з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны быў ахоплены гневам і нянавісцю, смуткам і гордасцю, якімі былі ахоплены ўсе совецкія людзі. Цяпер ужо не «падносіць цэглу» дапамагае яго паэзія народу, а—

Каб за сонцам услед
... па трупах варожых
Хоць на некалькі крокаў
Наперад прайсці.

Народнасць, характэрная для творчасці паэта і раней, у гады вайны выкрышталізоўваецца ў дасканалую чысціню яго вершаў, у захапляючую яркасць вобразаў. «Кастусь Каліноўскі», «Надзя-Надзейка», «Настачка» — гэта сапраўды народныя творы. Уся папярэдняя работа паэта прывяла яго да вельмі глыбокага, патэтычнага ў лепшым сэнсе гэтага слова верша-закліка «Будзем сеяць, беларусы...». Якая вялікая духоўная сіла народа, якая магутная яго маральная перавага над ворагам, калі ў самы цяжкі для Радзімы час ён жыве запаветнай марай і нязломнай верай:

Хутка вызваляцца гоні,
З-пад уціску, ад прымусу,
Будзем сеяць, беларусы,
На ўсход сонца чыстым зернем...
Смерць на захад мы павернем!

Маральнае ўздзеянне гэтага твора падобна да ўздзеяння такіх вершаў, як «Беларускім партызанам» Янкі Купалы, або «Забі яго» К. Сіманава.

Навошта ўспамінаць усё гэта?—могуць запытацца. — Пра творчасць-жа П. Броўкі ўжо напісана і сказана нямала. Выйшла новая кніга паэта «Сонечнымі днямі», пра яе-б і вясці адразу размову.

Такі погляд няправільны. Паспрабуйце вызначыць вартасці і недахопы гэтай кнігі без таго, каб не аглянуцца на творчасць, якая папярэднічала ёй. Адкрыйце першыя старонкі кнігі «Сонечнымі днямі», прачытайце вершы, якія ўводзяць чытача ў кола інтарэсаў паэта і яго лірычнага героя, — безумоўна-ж, гэта працяг тэм нядаўніх кніг П. Броўкі.

Лёгка чытаюцца ўсхваляваныя радкі «Маёй Айчыны», «Новага шляху», «Брэнявіка», «Расіі». Яны ўспрыймаюцца, як паэтычнае апавяданне, роздум услых пра падзеі апошніх гадоў, што далі новае асвятленне, напоўнілі новым зместам тыя разуменні, якія далі назвы вершам. Вось

Расія—
волатава сіла,
Пагляд крышталёвага святла —
Усіх з'яднала, прытуліла,
З сабой ў дарогу павяла.
. . . . . .
Наш край з табой непераможны,
Ты з ім, як маці і сястра!

Выпрабаванні вайны, у якіх беларускі народ увесь час адчуваў локаць верных сяброў, локаць братніх народаў, якіх «навекі з'яднала вялікая Русь», нараджаюць у паэта такія праніклівыя словы. Гордае ўсведамленне сілы, усёперамагаючай магутнасці гэтага загартаванага ў бітвах саюза народаў падказвае паэту хвалюючы адказ на даўняе пытанне Янкі Купалы: «А хто там ідзе?»:

Мы гэта вышлі
З пахмурнае ночы...
Мы не адны,
Мы ідзем грамадою,
Колькі ў нас радасці, што за сябрына:
Рускія з намі, украінцы, грузіны,
Армяне, літоўцы,—адной мы сям'ёю
Крочым пад яркай
Чырвонай зарою...
Моцныя духам, душой маладыя,
Бачым комуны агні залатыя.

Вернасць тэме, тэме совецкага патрыятызма радуе і сёнешнімі заваёвамі П. Броўкі, і абяцае новыя дасягненні ў будучым.

Аднак ёсць у вершах, якія адкрываюць кнігу «Сонечнымі днямі», недахоп. Ён становіцца больш зразумелым таму, што наглядаўся раней. Не заўсёды паэт багацце сваіх жыццёвых уражанняў, глыбіню сваіх думак і дакладнасць меркаванняў заключае ў закончаную паэтычную форму. Часам у асобнай страфе, якую можна цытаваць як самастойны кароткі верш, перададзены ўжо змест усяго твора. Папярэднія і наступныя не развіваюць, а паўтараюць перададзенае ў гэтай страфе. Той-жа адказ на пытанне «Хто там ідзе?» (верш «Новы шлях») мог быць напалову карацейшым. Кампазіцыйнага адзінства не знойдзена паэтам.

Могуць запярэчыць: паэмы «Думы пра Маскву» і «Беларусь» напісаны прыблізна ў той-жа манеры. Правільна, ды не зусім. Справа ў тым, што гэтыя творы — хутчэй патэтычныя маналогі, вымаўленыя, як кажуць, на адным дыханні, г. зн. тады, калі сэрцу трэба выказацца да канца, калі кожнае слова народжана эмацыянальным уздымам, які хвалюе чытача і слухача. Тады і простыя, звычайныя словы адкрываюць як-бы невядомую раней прыгажосць і сілу роднай мовы.

Іншая справа ў названых вышэй вершах з кнігі «Сонечнымі днямі». Лірычны герой паэта неяк больш суха, больш разважліва выяўляе свае пачуцці і выказвае думкі. Вось захацеў ён сказаць пра сваю любоў да Радзімы, паэт стаў шукаць дэталі, а знайшоў толькі геаграфічныя назвы, да якіх далучаны агульныя эпітэты:

Мая айчына —
Поле, нівы,
Над Нёманам зялёны гай,
Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы...

Далей:

Я палюбіў навечна,
Шчыра
Алтай, Палтаўшчыну і Крым...
Ад Ленінграда да Паміра,
Радзіма, ў сэрцы ты маім!

Вы прачыталі гэтыя радкі. Ці запомнілі вы «зялёны гай», «прыгожы Брэст» або «Мінск шумлівы»? Ці абудзілі ў вас якія-небудзь думкі і хваляванні пералічаныя «Алтай, Палтаўшчына і Крым»? Вы перагортваеце кнігу, вам, натуральна, хочацца сустрэць развіццё гэтай тэмы, — ну хоць-бы прачытаць пра «шумлівы Мінск» або пра Памір. Не, развіцця гэтая тэма не атрымала. Вядома, у 1950 годзе вершы пра Трактарагорад у Мінску, дзе паведамляецца, што горад «будзе збудаваны», што ён яшчэ толькі «ўзнімецца ў працы няспынай», успрыймаюцца, як вершы ўчарашняга дня. Сёння нельга сабе ўявіць шумлівы Мінск без ужо адбудаванага пасёлка трактарнага завода, што шуміць кіпучым жыццём. Другі верш пра нашу сталіцу — «Ленінградскі трамвай»— таксама водгук на падзею пазалеташнюю. І няхай ён будзе нават вельмі хвалюючым, шумлівы Мінск з гэтага аднаго верша выразна не паўстане.

У кнізе змешчаны вершы аб Карэліі. Верыш, што паэт адчуў паэтычнае захапленне гэтым некалі сонным і панурым краем, што палюбіў яго, пераўтворанага совецкімі людзьмі. Але вершы аб Карэліі засталіся толькі штрыхом у творчай біяграфіі паэта. А магчы-ж гэтыя два вершы абрасці яшчэ некалькімі творамі і стаць каштоўным укладам у паэзію, якая ўслаўляе дружбу народаў СССР. Успомнім, напрыклад, вершы аб Грузіі Н. Ціханава.

Такая недасказанасць асабліва прыкрая, калі бачыш, што яе магло не быць. Дэкларатыўныя вершы аб Беларусі знаходзяць змястоўную расшыфроўку ў зборніку. Вельмі кранаюць, напаўняюць сэрца радаснай песняй такія творы П. Броўкі, як «Дзень добры, хлопцы», «На Палессі гоман, гоман»! Тут наглядальнасць паэта злілася з яго каштоўным дарам гумару і знайшла выхад у песеннай стыхіі, якая захапляе чытача, перадае яму хваляванне аўтара ў жыццесцвярджальным, вясёлым рытме:

На Палессі гоман, гоман...
А шумліва, як ніколі,
Заспрачаліся там днямі
Ніва з нівай, поле з полем,
Калосы ды з каласамі:
Што ўзрасло з іх самавіта,
Хто з іх можа ганарыцца —
Ці то бульба, ці то жыта,
Ці то грэчка, ці пшаніца?
. . . . . .
Пераходзяць зімы, весны,
Усё ідзе сваёй чаргою.
Там дзе праца, там—і песні!

Інтанацыйнае багацце такога верша робіць вельмі прывабнай сваёй глыбінёй ідэю твора — не тыя беларусы, што былі да 1917 г. Яна пераклікаецца з «Новым шляхам»:

Мы не лапцюжныя,
Мы ўжо не тыя...

У нашы дні, дні ўсенароднай барацьбы за мір, асабліва пажаданымі, асабліва блізкімі чытачу робяцца словы пра мірную стваральную працу, пра мірных совецкіх людзей. П. Броўка ўбачыў паэзію і сапраўды волатаўскую веліч працы сціплага чалавека, зрабіў яго героем невялікіх вершаваных навел. Паэтычныя партрэты ў творах «Калгасны мельнік», «Кладаўшчык», «Каваль», «Плытагон», «Сымонка», «Архітэктар» робяць людзей сацыялістычнага грамадства адчувальнымі, блізка знаёмымі чытачу. Паэт нібы гаворыць: вось яны, мае слаўныя сучаснікі, мае гераічныя землякі, гапарыцеся іх сціплай працай і прыгажосцю іх духоўнага свету. Знаёмімся мы з імі, і ўспамінаецца нам тост таварыша Сталіна: «За людзей простых, звычайных, сціплых, за «вінцікі», якія трымаюць у стане актыўнасці наш вялікі дзяржаўны механізм...».

Яшчэ больш радасныя сустрэчы з гэтымі людзьмі ў паэмах П. Броўкі. У новую кнігу паэт уключыў тры з іх — «Бацькаў дом», «Родныя берагі», «Добры друг». Розныя па сваіх мастацкіх якасцях, яны прадыктаваны адзінай задумай. Паэт настойліва працуе над стварэннем эпічнага апавядання аб совецкіх людзях, аб працаўніках Беларусі, якія шмат перанеслі ў ваенныя гады, шмат перадумалі і адчулі і выйшлі на светлую дарогу.

Даўно чакаў чытач паэтычнага апавядання аб «службе аграномавай». І вось яно ёсць. Чытаеш першыя радкі паэмы «Родныя берагі» і разам з аграномам Сцяпанам Пятровічам пачынаеш «жыццё паходнае».

Налева — роўнядзь,
Справа—бор,
Снуюцца сцежкі кроснамі,
Чатыры рэчкі,
Пяць азёр,
Гара Мядзведзь над соснамі.

Шкада толькі, што хутка мільгаюць гэтыя, мабыць, прыгожыя месцы, якім-бы ўваходзіць у развіццё падзей паэмы не проста фонам, а красамоўным акампанімментам! Але, прымірыўшыся з бегласцю пейзажных замалёвак, едзем далей. Усё-такі, што за чалавек аграном Сцяпан Пятровіч? Паэт, улюблёны сам у свайго героя, прымушае пранікнуцца да яго павагай, як да добрага знаёмага. Чаму-ж толькі як да знаёмага, а не сябра? Аўтар паскупіўся. Ён не раскрыў шырока духоўны свет героя. Мы ведаем, якія клопаты ў героя, што ён робіць. Але думы яго, яго хваляванні толькі названы ў паэме. І хочацца не то што, каб слоў было сказана больш, а каб больш важкімі, больш змястоўнымі былі яны. Сцяпан Пятровіч

Успомніў бітвы,
Партызан,
Як ваяваў з сябрамі.

А чаму ён успомніў гэта? У паэме ёсць тлумачэнне — аграном сустрэў магільны курган, пад якім пахаваны яго баявыя сябры, але для сюжэтнага развіцця паэмы гэтая сустрэча зусім не абавязковая. Не закончана і любоўная лінія ў паэме. Любоў агранома да калгасніцы Ганны арганічна не ўплецена ў апавяданне пра яго службу. Зноў адчуваецца забыццё П. Броўкам такога вяжучага сюжэт матэрыялу, як лірычны голас аўтара. Змястоўная гісторыя пра тое, як аграном Сцяпан Пятровіч дапамагаў калгаснікам раёна выпрацаваць высокія ўраджаі, была-б намнога больш цэласнай, больш стройнай з уняссеннем у яе лірычных матываў.

Паэма «Добры друг» больш цікавая. Чаму? І яна-ж — апавяданне пра сельскага інтэлігента? І яе гераіня Лена, працуючы сельскім доктарам, паказана пераважна ў працы? Але не толькі ў працы. Яе любоў да Андрэя, таварыша па інстытуту, які адмовіўся ехаць у «сельскую глушэ», робіць больш выразнай індывідуальнасць гераіні. Няхай Андрэй і не з'яўляецца ў паэме, але мы пераконваемся, што ўся праца Лены ёсць працяг яе спрэчкі, — больш таго, яе барацьбы з адсталымі поглядамі, з перажыткамі мінулага. Чытач адчувае духоўную прыгажосць гэтага чалавека, адчувае паэзію яго працы. Гэтаму дапамагаюць добра выпісаныя паэтам вобразы іншых персанажаў. Але вось прачытаны абедзве паэмы — і цяжка ўявіць, дзе адбываецца іх дзеянне. Ці не суседзі аграном Сцяпан Пятровіч і Лена? Вось-жа

Поле,
За полем — задумлівы лес,
Просты, абсаджаны клёнам бальшак,
Дом соцкультуры,
Сяльпо,
МТС,
Новы ля школы пасаджаны парк.

Ну, вось-вось вышмыгне сюды на веласіпедзе Сцяпан Пятровіч... Але не! Тут працуе Лена. У чым-жа справа? Непераадоленыя яшчэ канчаткова шматслоўная дэкларатыўнасць, апісальнасць, схільнасць да сузіральнасці робяць паэмы недасканалымі з пункту гледжання майстэрства іх кампазіцыйнай пабудовы і раскрыцця канкрэтных індывідуальнасцей. Калгаснага камсорга Сёмку Віруту не пераселіш з паэмы «Добры друг» у «Родныя берагі». Гэтак-жа і дзядзька Ігнась, і маленькі Піліпок неад'емны ад герояў «Добрага друга». Астатнія-ж персанажы зусім нельга адрозніць адзін ад другога. Вось у іх

... пайшла тады гаворка,
А пра што —
Ды рознай шмат:
Пра вячоркі,
Сходкі, зборы,
Аб сваім-жа лёне зноў,
Пра істужкі,
Пра уборы,
І, бывае, пра хлапцоў.

Аб чым тут не нагаворана, а нашто? Гутарка, апісаная так па-інфармацыйнаму, не характарызуе дзейных асоб, а, наадварот, робіць іх расплыўчатымі. На шчасце, у той-жа паэме П. Броўка знайшоў надзвычай удалыя па сваёй жыццёвай праўдзівасці дыялогі Лены з Піліпком, з прафесарам Якавам Іванавічам. Яны вось і даюць чытачу ўяўленне аб індывідуальным вобліку герояў.

Як бачым, кніга «Сонечнымі днямі» вельмі няроўная. У ёй няма цэласных цыклаў вершаў. Яна некалькі стракатая па падбору твораў. Чытач, вядома, абынакава праміне агульныя месцы, дзе многаслоўе выцесніла глыбокую думку і замяніла шчырае пачуццё павярхоўным апісаннем. Ён надоўга затрымаецца і ўсхвалявана перачытае старонкі, у якіх ёсць сапраўдная паэзія, паэзія вялікіх пачуццяў і думак, што ўвасоблены ў яркія самабытныя вобразы. Гэтаму дапамагае рытміка верша, свежасць вобразных выяўленчых сродкаў паэта. Глыбокі совецкі патрыятызм, якім адухоўлены лепшыя старонкі кнігі «Сонечнымі днямі», дойдзе да сэрца чытача, і, несумненна, слова паэта будзе «падносіць цэглу», дапамагаючы нашым людзям больш смела і ўпэўнена ісці ў заўтрашні сонечны дзень.

Прапаганда кнігі ў раённай газеце

У тым, што ў Старадарожскім раёне мастацкая кніга карыстаецца шырокай папулярнасцю сярод насельніцтва, не малую ролю адыграла раённая газета «За Совецкую Радзіму», са старонак якой не сходзяць раздзелы: «Кніжныя навіны», «Кніжная паліца», «Чытачы аб прачытаных кнігах», «Пачытайце гэтую кнігу» і г. д.

Газета сістэматычна друкуе спісы новых кніг, знаёміць чытачоў з творамі, якія ёсць на паліцах у бібліятэках і магазінах раёна.

На старонках раённай газеты друкуюць свае ўражанні аб прачытанай кнізе самі чытачы. Самае важнае, што гэта робіцца не ад выпадку да выпадку, а строга прадумана і даволі часта. Дастаткова сказаць, што са сваімі ўражаннямі толькі ў гэтым годзе ўжо выступіла звыш 15 чытачоў. Сярод іх можна сустрэць прозвішчы служачага Івана Ермаловіча, рабочага Пятра Дубіны, калгасніка Адама Манько, трактарыста Апанаса Лазука, школьніка Івана Акуратнава і інш.

У раздзеле «Прачытайце гэтую кнігу» рэдакцыя сістэматычна друкуе рэцэнзіі на новыя кнігі. Пасля рэцэнзіі настаўніцы сельскай пачатковай школы Аляксандры Сцежка на паэму А. Яшына «Алёна Фаміна» многія мясцовыя калгасніцы прачыталі гэтую паэму. Варта адзначыць такелма рэцэнзію калгасніка Андрэя Даўгучыца на кнігу С. Бабаеўскага «Кавалер Залатой Звязды», рэцэнзію служачага Івана Ермаловіча на кнігу Ю. Лапцева «Зара» і інш. Аб чым яны гавораць? Аб тым, што героі кніг хвалююць чытачоў, выклікаюць у іх многа думак, натхняюць на вялікую стваральную працу ў калгасе, на заводзе, ва ўстанове.

Часта можна пачуць, як у некаторых рэдакцыях гавораць: «Самі бачыце, наша газета малая па фармату. І не ведаеш, што змясціць у ёй». Усё гэта выдуманыя «перашкоды». Старадарожская раённая газета знаходзіць месца для прапаганды совецкай кнігі.

Раённая бібліятэка ўжо ў гэтым годзе мае ў сем разоў больш кніг, чым у мінулым; яна налічвае ў 10 разоў больш чытачоў, чым два гады таму назад; кніжны магазін раёна прадаў за восем месяцаў гэтага года ў тры разы больш кніг, чым за два мінулыя гады; сотні калгаснікаў, рабочых і служачых маюць свае ўласныя бібліятэкі; 80 процантаў насельніцтва раёна з'яўляюцца чытачамі бібліятэк. Ва ўсім гэтым — значная заслуга раённай газеты.

К. САНКЕВІЧ.

г. Старыя Дарогі.

Студэнцкае навуковае таварыства

У мінулым годзе ў Мінскім Дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага было арганізавана навуковае таварыства.

Пры таварыстве створаны гурткі рускай і беларускай літаратуры, замежнай літаратуры, мастацтвазнаўчы, лінгвістычны, дыялекталагічны і творчы гурткі, якія выпускаюць рукапісны часопіс «Першыя крокі». Ужо вышла пяць нумароў часопіса, на старонках якога маладыя паэты і празаікі М. Лазарук, Н. Вялюга, Д. Лось, Д. Талстой, Д. Лапацін і інш. змяшчаюць свае творы.

Акрамя часопіса выпускаецца газета «Наша творчасць». Нядаўна вышаў пяты нумар гэтай газеты, на старонках якой змешчаны творы А. Ставера, М. Лазарука, А. Сердзюкова, У. Ляпёшкіна і інш.

Навуковыя работнікі інстытута аказваюць штодзённую дапамогу творчым гурткам. Асабліва добра кіруе працай дыялекталагічнага гуртка дацэнт Н. Вайтовіч. Члены гэтага гуртка Н. Шуба, В. Мяцельскі і Н. Купрыянчык ездзілі ў экспедыцыю па збору матэрыяла для дыялекталагічнага атласа гаворак БССР.

Навуковае таварыства правяло творчыя канфярэнцыі, прысвечаныя 70-годдзю з дня нараджэння І. В. Сталіна, 25-годдзю з дня смерці В. І. Леніна, а таксама канфярэнцыю, прысвечаную творчасці Ул. Маякоўскага і абмеркаванню лепшых работ студэнтаў інстытута. Адбыўся дыспут па кнізе «Глыбокая плынь» І. Шамякіна.

Ул. ЛЯПЁШКІН,
студэнт IV курса педінстытута.

Абласная выстаўка народнай творчасці

17 верасня—у дзень святкавання 11 гадавіны ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве—у Магілёве адкрылася абласная выстаўка народнай творчасці.

На выстаўцы экспануюцца работы старэйшага мастака-самавучкі А. Цыбулькіна: «Вечар на калгасным полі», «Рыбацкая арцель па Дняпры», «Беларускія пейзажы» і інш.

Профіль Крэмля выканаў калгаснік з Дрыбінскага раёна тав. Сальнікаў.

Творчасць выхаванцаў Недашэўскага дзіцячага дома (разьба па дрэву) прадстаўлена барэльефамі «Ленін і Сталін», работамі «Пераправа праз Дняпро», «Люба Шаўцова ўздымае сцяг», «Чапаеў» і інш. Усе работы выкананы пад кіраўніцтвам вопытнага інструктара па працы тав. Вольскага. Выкладчык педінстытута тав. Васіленка экспанаваў на выстаўцы работу «Суворaў» (гіпс).

Асобнае месца займае мастацкая вышыўка, якая выканана т. т. Стэльмах, Шастаковіч і Бондаравай.

На выстаўцы экспануецца 44 скульптуры і карціны.

Лепшыя работы будуць накіраваны ў Мінск на рэспубліканскі конкурс.

Г. МАРОЗАЎ,
старшы інспектар Абласнога Дома народнай творчасці.

У мастацкім совеце кіностудыі „Беларусьфільм"

Пры кіностудыі «Беларусьфільм» ужо другі год працуе мастацкі совет. Але ён слаба выконваў свае функцыі. Па-за яго ўвагай доўгі час заставалася хранікальная прадукцыя. Кіночасопісы, іх сюжэты, музычнае афармленне да гэтага часу амаль не абмяркоўваліся на мастацкім совеце. Толькі сігналы большэвіцкага друку аб нізкай якасці кіночасопісаў звярнулі на сябе яго ўвагу. Гэтымі днямі на паседжанні мастацкага совета былі прагледжаны і абмеркаваны кіночасопісы «Совецкая Беларусь», якія выпушчаны кіностудыяй у чэрвені—жніўні гэтага года. З крытычным разборам прадукцыі выступіў начальнік вытворчага аддзела Міністэрства кінематаграфіі БССР М. Блісцінаў. Адзначыўшы зрухі ў павышэнні якасці кіночасопісаў, дакладчык рэзка крытыкаваў асобныя часопісы. Большасць з іх зроблены на нізкім узроўні. Так, сюжэт аб чыгуначніку (часопіс № 23) зняты апаратарамі С. Фрыдам і Ул. Кітасам без выразнай кампазіцыйнай пабудовы. Дрэнна зняты і сюжэт аб Усебеларускай спартакіядзе. Асобныя разрозненыя кадры не ствараюць поўнага ўражання аб напружанай барацьбе спартсменаў за пяршынства. Часопіс № 24, прысвечаны цікавай і актуальнай тэме — прыезду сялян заходніх абласцей у калгасы Мінскай вобласці, — зняты шэра (апаратары І. Вейняровіч, В. Цяслюк). Дыктарскі тэкст (аўтар М. Пенкрат) слабы, невыразны. У ім многа штампа і трафарэта. Усе гэтыя недахопы абумоўлены тым, што рэжысёры мала ўдзельнічаюць у распрацоўцы і здымках сюжэтаў.

У абмеркаванні кінопрадукцыі прынялі ўдзел І. Гутараў, В. Вітка, нам. міністра кінематаграфіі БССР Н. Гасціловіч, Н. Каменская, народны артыст СССР Г. Глебаў, рэжысёры і апаратары студыі. Усе выступаючыя сурова крытыкавалі хранікальную прадукцыю. Кіночасопісы «Совецкая Беларусь» яшчэ не адказваюць запатрабаванням совецкага гледача. Тэматыка іх адпастайная. Яна не ахоплівае ўсёй разнастайнасці падзей. Важнейшыя з'явы жыцця не знаходзяць свайго адлюстравання ў часопісах. Слаба паказаны наватары вытворчасці. Не адлюстроўваецца побыт беларускага народа, дасягненні беларускай культуры, прыродныя багацці рэспублікі. Апяратары і рэжысёры не шукаюць новых форм і цікавых выяўленчых рашэнняў, не працуюць над кампазіцыяй кадра. Слабым месцам у часопісах з'яўляецца музычнае афармленне сюжэтаў (Ю. Бельзацкі). Часта музыка не адпавядае выяўленчаму матэрыялу. Не выкарыстоўваюцца ўсе багацці музычных форм — ад сімфанічнай музыкі да масавай песні; вельмі мала выкарыстоўваецца беларуская музыка. Аўтары тэкста не працуюць над культурай слова, яго выразнасцю. Мастацкае афармленне часопіса, гукапіс, лабараторная апрацоўка яшчэ знаходзяцца не на дастатковым узроўні і не адпавядаюць высокаму тэхнічнаму ўзроўню совецкай кінематаграфіі.

Апяратар І. Вейняровіч рэзка крытыкаваў работу Міністэрства кінематаграфіі, і ў прыватнасці работу вытворчага аддзела. Міністэрства, гаворыць І. Вейняровіч, дагматычна падыходзіць да планавання сюжэтаў. Часам важнейшыя пікавыя падзеі не здымаюцца, таму што яны не запланаваны. Марудна праходзіць заверджанне дыктарскіх тэкстаў. Так, дыктарскі тэкст часопіса № 24 праляжаў у міністэрстве каля 10 дзён. Кіруючыя работнікі міністэрства не ўнікаюць глыбока ў творчы працэс, не працуюць з творчым калектывам.

Мастацкі совет унёс рад канкрэтных прапаноў, якія будуць садзейнічаць далейшаму павышэнню ідэйна-мастацкай якасці кіночасопісаў, росту майстэрства творчых работнікаў.

Дапамогу ва ўзнясці якасці прадукцыі павінна аказаць шырокая совецкая грамадскасць, з якой кіностудыі неабходна трымаць шчыльную сувязь. Трэба ліквідаваць адарванасць, замкнутасць творчага калектыва ад пісьменніцкай грамадскасці. Неабходна шырока практыкаваць абмеркаванне хранікальнай прадукцыі, чарысаў, фільмаў на творчых «чацвергах». Гэта дапаможа калектыву кіностудыі ўзняць якасць сваёй працы.

В. СТРАЛЬЦОЎ.

Навуковыя экспедыцыі

Інстытут мовы, літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР правёў сёлета рад цікавых і карысных навуковых экспедыцый.

Навуковыя супрацоўнікі сектара дыялекталогіі сумесна са студэнтамі старэйшых курсаў філалагічных факультэтаў Дзяржаўнага універсітэта імені В. І. Леніна і педагагічнага інстытута імені А. М. Горкага наведалі Бягомльскі і Халопеніцкі раёны Мінскай вобласці, Полацкі і Ветрынскі раёны Полацкай вобласці. Яны там вывучылі дыялекты беларускай мовы, сабралі каштоўны матэрыял, які будзе выкарыстан для складання дыялекталагічнага атласа беларускай мовы.

Экспедыцыя, якую ўзначальвала кандыдат філалагічных навук дацэнт Жыдовіч, сабрала шмат фальклорнага матэрыялу на тэмы партызанскай барацьбы. Усе запісы зараз вывучаюцца і картаграфіруюцца.

Такую экспедыцыю правяла і кафедра беларускай мовы Дзяржаўнага універсітэта імені В. І. Леніна.

Артысты філармоніі ў калгасе

20 верасня каляктыў аркестра народных інструментаў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі накіраваўся ў Пухавіцкі раён— у падшэфны калгас імя Карла Маркса.

Цэлы дзень каляктыў працаваў у полі, а ўвечары даў для калгаснікаў канцэрт. Клуб быў перапоўнены. Старшыня калгаса ва ўступным слове зрабіў кароткую справаздачу аб праведзенай працы.

Аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР І. Жыновіча выканаў сюіту на беларускія тэмы М. Чуркіна, «Лявоніху» ў апрацоўцы Жыновіча, «Музыкальны момант» Шуберта і інш. Артыстка Е. Байрашэўская пад акампанімент аркестра выканала беларускія народныя песні «Ой, цвіці, кудравая рабіна», «Хлопец кучаравы», «Чабарок» і інш. Артыстка Л. Маркалёва прачытала некалькі літаратурных твораў.

Старыя недахопы ў новых выданнях

Класічныя работы таварыша І. В. Сталіна па мовазнаўству з'явіліся каштоўнейшым укладам у навуку. Вялікі правадыр даў бліскучы ўзор таго, як трэба карыстацца адзіна правільным метадам пазнання — марксісцка-ленінскім, паказаў прыклад таго, як трэба прымяняць гэты метад да канкрэтнай галіны навукі. Совецкае мовазнаўства, якое прыхільнікамі Н. Я. Мара было заведзена ў тупік і перажывала крызіс, выведзена на шырокую, прасторную дарогу. Работы таварыша Сталіна з гранічнай выразнасцю і дакладнасцю ўскрылі сур'ёзныя недахопы ў навуцы аб мове і ўказалі на шлях іх ліквідацыі.

Выступленні правадыра па мовазнаўству з'яўляюцца сведчаннем таго, якое велізарнае значэнне надае партыя пытанням развіцця совецкай лінгвістыкі. Наш народ чакае ад вучоных рашучай перабудовы на аснове ўказанняў І. В. Сталіна. Перабудова гэтая павінна ісці як у напрамку выкаранення памылак і недахопаў, прынесеных у мовазнаўства прыхільнікамі так званага «новага вучэння» аб мове, так і ў напрамку распрацоўкі кардынальных пытанняў мовы ў святле сталінскіх выступленняў. Неабходна адпаведным чынам змяніць выкладанне мовазнаўчых дысцыплін у навучальных установах, перагледзець вучэбныя дапаможнікі, падручнікі і праграмы па мове.

У сувязі з выступленнямі І. В. Сталіна, якія паставілі важную задачу барацьбы за чысціню совецкага мовазнаўства, за чысціню лінгвістычнай навукі, сур'ёзная ўвага павінна быць таксама нададзена выкладанню мовы ў сярэдняй школе.

Іменна на абавязку сярэдняй школы ляжыць закладванне трывалага падмурка ведаў па мове, іменна тут будучыя маладыя спецыялісты розных галін народнай гаспадаркі авалодваюць дысцыплінай, якая ў многім будзе вызначаць іх культуру. Школа прывівае вучням любоў да роднага слова, вучыць іх прыгожай жывой мове, вучыць правільна карыстацца гэтым важнейшым сродкам зносін паміж людзьмі.

Агульнавядома, якую ролю ў выхаванні ў школе адыгрывае настаўнік. Далёка не малаважнае значэнне ў сістэме школьнага навучання мае падручнік.

Школьны падручнік—аснова працы настаўніка і вучня. І ад таго, наколькі ўдалым будзе гэты падручнік, наколькі будзе ён адпавядаць патрабаванням, якія прад'яўляюцца да дадзенай дысцыпліны ў школе, у значнай ступені залежыць поспех выкладання.

У якой-жа меры падручнікі па беларускай мове адказваюць свайму прызначэнню? Ці пазбаўлены яны недахопаў, якія пры паўторных перавыданнях трэба выпраўляць?

На жаль, такіх недахопаў яны не пазбаўлены.

Першы і асноўны недахоп, агульны для ўсіх падручнікаў па роднай мове,—гэта не заўсёды ўдалы падбор моўнага матэрыялу — паасобных сказаў, вершаў, урыўкаў. Вядома, што навучыць школьніка правільнай, прыгожай мове можна толькі на граматычна бездакорных тэкстах, на ўзорах літаратурнай мовы. Таму зусім натуральнай з'яўляецца тая відавочная ісціна, што ў падручніку па мове нецярпімы ўсякая неахайнасць, недакладна пабудаваны сказ, нязграбны выраз, непісьменнасць.

Якраз прыкладаў гэтага ў падручніках па мове, хоць некаторыя з іх вытрымалі па шэсць выданняў і неаднаразова выпраўлялися, можна знайсці нямала.

У другой частцы «Граматыкі беларускай мовы» М. І. Жыркевіча і А. С. Карзона чытаем: «Хай ачысціцца зямліца для сяўбы і для **рунявасці**», «Раздаўся выбух; вагоны і паравоз паляцелі» (?); «Пад сцягам, **хілячы чало**, стаяў казацкі строй»; «І неба ў нас — крэпасць сваёй абароны» і інш.

У падручніку К. І. Шапялевіча і А. К. Севярнёвай для 3-га класа «Беларуская мова» (выданне 6-е, выпраўленае) вучням прапануецца такая «паэзія»:

ПЕСНЯ ПРА КАНЯ

Праз лугі, лясы, балоты
Брала конніца бар'ер (?!),
Няслася конніца галопам,
Вораг выў, як дзікі звер.
Конь—прыяцель, конь—таварыш
І на полі, і ў страі.
У час **будучых пажарышч**
Будзем разам у баі.
З вараным сваім я разам
Паскачу ў рашучы бой —
Ні гарматы і ні газы
Не разлучаць нас з табой.
Кроў у жылах не астудзім
І ў баі не ляжам ніц...

Аўтары падручнікаў не заўсёды звяртаюць увагу на сэнс, на логіку тэкстаў, таму вучням даводзіцца чытаць творы, накшталт пустога і беззмястоўнага апавядання «Белячок» (А. К. Севярнёва і К. І. Шапялевіч, «Беларуская мова», падручнік для 4-га класа). У ім расказваецца, як у калгасе быў конь Белячок. Аднойчы на ім павезлі ў горад збожжа. Вярталіся позна. Узнялася мяцеліца. «Белячок стаў. Ён пастаяў, панюхаў вецер, а потым ціхенька кранўўся з месца і пайшоў. Праз гадзіну мы ўжо былі дома». Вось і ўсё апавяданне. Такую-ж бяздумнасць пад загалоўкам «Жарт» знаходзім у падручніку для 2-га класа А. К. Севярнёвай і К. І. Шапялевіча:

— Ці не бачыў маю козачку?

— А якая яна?

— Беленькая.

— Пабегла па беленькай дарожцы.

Няўважлівасць аўтараў да падбору тэкстаў выяўляецца таксама ў паўтарэнні адных і тых-жа тэкстаў, адных і тых-жа практыкаванняў. Так, у падручніку для 4-га класа двойчы змешчаны верш «Першы гром»; у падручніку для 4-га класа на стар. 113 надрукавана страфа з верша «Па полі, полі чыстым...», праз дзве старонкі гэтая-ж страфа паўтараецца. Двойчы надрукаваны верш «Зайчык» у падручніку для 2-га класа. Адны і тыя-ж тэксты і практыкаванні сустракаюцца не толькі ў адным падручніку,—яны пераносяцца з падручніка ў падручнік. Так, у 3-м класе вучням прапануецца спісаць верш «Арлы маладыя» і падкрэсліць асабовыя займеннікі (стар. 88); гэтае-ж самае практыкаванне прапануецца і вучням 4-га класа (стар. 94). У першай частцы «Граматыкі беларускай мовы» змешчана практыкаванне (з ліста акадэміка Паўлава да моладзі) на расстаноўку адмоўя **не (ня)** і **ні**, а ў другой частцы «Граматыкі» надрукаваны гэты-ж тэкст, дзе адмоўе пастаўлена. Верш «На лузе» змешчаны ў падручніках для 3-га класа і для 4-га класа, верш «Песня аб вясне»—для першага класа (аўтары К. І. Шапялевіч і А. К. Севярнёва) і для другога класа (праўда, для 2-га класа пад іншай назвай — «Мароз»). Асабліва пашанцавала апавяданню пра Гастэла. Апавяданне гэта надрукавана з нязначнымі зменамі ў трох падручніках: для 4-га класа, у першай і другой частках «Граматыкі беларускай **мовы**».

Безумоўна, гэтыя паўтарэнні—не вынік таго, што аўтары падручнікаў дзейнічалі згодна прынцыпа «паўтарэнне—маці вучэння», а вынік нядбайнага стаўлення да адбору тэкстаў і практыкаванняў.

Недапушчальнай з'яўляецца непісьменнасць у падручніках па мове. А між тым, яна сустракаецца. Так, у першай частцы «Граматыкі беларускай мовы» М. І. Жыркевіча і А. С. Карзона напісана: «настарожваў» (стар. 167), «аўраг» (стар. 205), «прадрассветны» (стар. 132); «дамы яшчэ занесены снегам да **крыш**» (стар. 144, частка другая) і інш.

Бясспрэчна патрабуюць перагляду паасобныя правілы правапісу, якіх прытрымліваюцца падручнікі. Гэта ў першую чаргу датычыцца «Граматыкі беларускай мовы» для сямігадовай і сярэдняй школы. Беспадстаўнасць і няправільнасць некаторых палажэнняў, якія сцвярджае граматыка, відавочная. Напрыклад, у правіле аб напісанні складаных слоў гаворыцца, што «складаныя словы, якія пачынаюцца з **поў (палавіна)**, а другая частка якіх з'яўляецца нескарочаным словам, маюць два націскі. Другі, пабочны націск ставіцца на слове **поў**, якое пішацца праз **о**». У доказ гэтага палажэння прыводзяцца прыклады: **поўднёвы, поўгоддзе, поўстанак.** Аўтары падручніка не заўважаюць, што прыведзеныя прыклады абвяргаюць іх сцверджанне: у названых словах другая частка—якраз скарочаная, самастойна не ўжываецца **(днёвы, годдзе, станак)**, а таму патрабуе іншага напісання. «Арфаграфічны слоўнік» Р. Судніка і М. Лобана, які знаходзіцца ў карыстанні вучняў у якасці навучальнага дапаможніка, піша гэтыя словы па-іншаму і па-іншаму фармулёўе дадзенае правіла: «Складаныя словы,—вучыць «Слоўнік»,—у якіх першай часткай з'яўляецца **паў**, падлягаюць правапісу простых слоў: **паўметра, паўсотні, паўтраця, паўяблыка, паўаркуша, запаўцаны, дапаўсмерці, упаўголаса**». Каму-ж павінен верыць вучань і настаўнік—падручніку ці «Слоўніку»? Між іншым, гэта не адзінае разыходжанне паміж школьнай граматыкай і «Арфаграфічным слоўнікам». «**Д і т**, стаўшы перад галоснымі **е, ё, я, ю, і**,—чытаем у першай частцы «Граматыкі беларускай мовы»,—**змякчаюцца** і пераходзяць **д у дз**, а **т у ц** (мяккае)». «Арфаграфічны слоўнік» трымаецца іншай думкі: «Заўсёды цвёрдыя **д, т**, стаўшы перад галоснымі **е, ё, і, ю, я, змякчацца не могуць**, а пераходзяць у **дз** і **ц**».

Гэтыя і больш дробныя недахопы падручнікаў па мове (у прыватнасці — скажэнне паасобных літаратурных цытат, літаральны празаічны пераклад вершаў з рускай мовы на беларускую, адсутнасць спасылак на аўтара пры цытаванні яго тэкста, калі пры астатніх тэкстах ёсць спасылкі, і інш.) безумоўна патрабуюць выпраўлення пры перавыданні.

Школьныя падручнікі, па якіх наша моладзь навучаецца культуры мовы, павінны быць бездакорнымі.

Ів. КУДРАЎЦАЎ.

Новыя кнігі

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі наступныя кнігі:

Рэдакцыя мастацкай літаратуры.

Якуб Колас. «Дрыгва». Аповесць. На рускай мове. Пераклад з беларускага В. Тарсіса. Мастак С. Раманаў. Тыраж 30000 экз., стар. 188. Цана 6 руб. 50 кап.

Н. В. Гогаль. «Мёртвыя душы». Паэма. Пераклад М. Машары. Вокладка, франтыспіс і тытул мастака В. Басава. Тыраж 5000 экз., стар. 356. Цана 13 руб. 45 кап.

Н. В. Чарнышэўскі. «Што рабіць?». З апавяданняў аб новых людзях. На рускай мове. Партрэт працы мастака Г. Вярэйскага. Пераплёт і тытул мастака Л. Прагіна. Тыраж 10000 экз., стар. 476. Цана 8 руб.

Рэдакцыя дзіцячай і юнацкай літаратуры.

Максім Танк. «Урачыстае абяцанне». Вокладка і малюнкі мастака В. Бундзіна. Тыраж 8000 экз., стар. 72. Цана 2 руб. 50 кап.

М. Горкі. «Казкі». Малюнкі В. Варанецкага. Тыраж 20000 экз., стар. 30. Цана 2 руб.

Рэдакцыя музычнай літаратуры.

Я. Цікоцкі. «Перапёлачка». Для голаса з фартэпіяна. Словы А. Вялюгіна. Тыраж 1000 экз., стар. 10. Цана 1 руб.

Н. Сакалоўскі. «Тры песні». Для хора, голаса з фартэпіяна. Словы М. Клімковіча і А. Русака. Тыраж 1000 экз., стар. 16. Цана 1 руб. 50 кап.

Рэдакцыя вучэбна-педагагічнай літаратуры.

Ул. Агіевіч і М. Горцаў. «Роднае слова». Кніга для чытання ў трэцім класе пачатковай школы. Выданне трэцяе, выпраўленае і дапоўненае. Тыраж 200000 экз., стар. 392. Цана 5 руб. 75 кап.

Д. Фурманаў. «Чапаеў». Бібліятэка школьніка. Тыраж 20000 экз., стар 272. Цана 8 руб.

Н. В. Гогаль. «Вечары на хутары ля Дзіканькі». Пераклад М. Лужаніна. Бібліятэка школьніка. Тыраж 20000 экз., стар. 238. Цана 6 руб. 75 кап.

«Беларуская совецкая літаратура». Падручнік для IX—X класаў сярэдняй школы. Пад рэдакцыяй В. В. Барысенкі і М. Ц. Лынькова. Зацверджан Міністэрствам асветы БССР. Выданне другое, выпраўленае.

Тыраж 20000 экз., стар. 404. Цана 10 руб. 50 кап.

«Родная літаратура». Хрэстаматыя для 9-га класа сярэдняй школы. Склаў А. Кучар. Выданне трэцяе. Тыраж 5000 экз., стар. 376. Цана 10 руб.

«Пачатковая школа». Зборнік артыкулаў. Дапаможнік для настаўнікаў. Частка І. Рэдактар М. П. Малышаў. Склаў Б. П. Есіпаў. Тыраж 15000 экз., стар. 654. Цана 16 руб.

Здзіўляючая абыякавасць

Поўнакроўным жыццём жывуць нашы тэатры, драматургі, кампазітары, мастакі.

Улетку надзвычай цікавыя гастролі ў Харкаве правёў тэатр імя Янкі Купалы. У госці ў Мінск прыязджалі тэатры імя Якуба Коласа, імя Я. Вахтангава, Іванаўскі тэатр апярэты. Велізарным поспехам карысталіся на міжнародных конкурсах у Будапешце маладыя салісты балета В. Міронаў і Л. Ражанава (1949 г.) і салістка оперы Н. Гусельнікава (1950 г.). Гледачы сталіцы былі ўзрадаваны ўдалымі выступленнямі здольных маладых артыстаў драмы Д. Шпакавай, Г. Галкіна, В. Кудрэвіча.

Спяктакль «Калінавы гай» — першая самастойная творчая работа маладога рэжысёра-дэбютанта П. Сушко. Балетмайстра К. Мулер плённа працуе над новым варыянтам першага беларускага нацыянальнага балета «Салавей».

Яшчэ зусім нядаўна маладыя мастакі П. Масленікаў і М. Блішч паказалі свае першыя самастойныя работы ў галіне тэатральнага афармлення.

Тэатральныя крытыкі працуюць над гісторыяй беларускага тэатра. Праграма-праспект гісторыі, як вядома, ужо атрымала ўхваленне грамадскасці.

Толькі адна вельмі паважаная арганізацыя засталася ў баку ад жыцця — Беларускае тэатральнае аб'яднанне (нам. старшыні У. Уладамірскі, адказны сакратар М. Дзянісаў). Ні адна з праяў многастайнага жыцця ў мастацтве не ўсхвалявала яе, не парушыла мёртвага спакою. Усё прайшло міма БТА таксама, як і велізарная работа па марксісцка-ленінскай адукацыі работнікаў мастацтва, уздыму прафесіянальнага майстэрства і авалоданню імі творчай спадчынай К. С. Станіслаўскага.

Халодная абыякавасць да падзей, якія адбываюцца ў тэатры, бестурботнасць да таго, што хвалюе дзеячоў мастацтва, на жаль, стала заганным «стылем» дзейнасці прэзідыума БТА.

Тэатральная грамадскасць неаднаразова выказвала сваё глыбокае нездавальненне бяздзейнасцю прэзідыума тэатральнага аб'яднання. Аднак «воз и ныне там».

Узнікае зусім законнае запытанне: ці не час ужо замяніць абыякавых кіраўнікоў БТА людзьмі, здольнымі ўдыхнуць сапраўднае жыццё ў гэтую надзвычай важную арганізацыю?

Н. КАМЕНСКІ.

Кнігі ляжаць на складах

— Дзе купіць кнігу? — спытайцеся вы ў Лагойску і ніхто не здолее адказаць на гэта пытанне.

— Новых кніжак у продажу няма,— звычайна адкажуць вам.

І сапраўды, у раённым цэнтры, за 40 кілометраў ад Мінска, вы нідзе не знойдзеце патрэбнай вам кніжкі або свежага часопіса. Да сёнешняга дня тут няма нават кніжнага магазіна.

Падручнікі для школьнікаў прадае райспажыўсаюз. У раймагу, у цесным кутку, некалькі паліц застаўлены кніжкамі. Усё гэта падручнікі для вучняў. На верхніх паліцах відаць некалькі назваў кніг палітычнай і мастацкай літаратуры. Гэтыя кнігі стаяць запыленымі, год выдання іх — 1946—48.

— Толькі месца займаюць,—скардзіцца загадчык раймага тав. Бабічава.—І без кніжак хапае тавараў.

Пакупнікі чакаюць новых кніг палітычнай, спецыяльнай і мастацкай літаратуры, і, атрымаўшы адказ, моўчкі выходзяць.

А ў гэты час на складзе райспажыўсаюза ляжыць кніг больш як на 30 тысяч рублёў. Купіць неабходную кніжку вы здолееце толькі будучы асабіста знаёмым з тав. Бабічавай — яна прынясе кніжку са склада.

— Гандляваць літаратурай не наша справа, — гаворыць загадчык аддзела гандлю райспажыўсаюза тав. Альберс.— Ёсць для гэтага абласная кантора кнігагандлю.

Начальніка гэтай канторы тав. Левіна многія ведаюць у Лагойску. Вось ужо хутка паўгода, як Левін і яго супрацоўнікі прыязджаюць сюды ў камандыроўку, каб адкрыць кніжны магазін. Ужо ёсць загадчык магазіна, але самога магазіна няма — не падбяруць памяшкання.

Ёсць у Лагойску раённы аддзел «Саюздруку» (загадчык тав. Гарошка). Здавалася-б ён шырока разгорне забеспячэнне насельніцтва літаратурай. На справе-ж атрымліваецца зусім іншае. І тут на складзе нерухома ляжыць на 20 тысяч рублёў літаратуры. Тут ёсць палітычная, навукова-папулярная літаратура, кнігі лаўрэатаў Сталінскіх прэмій. Залежваюць гэтыя кнігі толькі таму, што няма каму прадаваць іх. Лістаносцы не прыцягнуты да распаўсюджвання літаратуры.

У жніўні ў раёне праводзіўся месячнік распаўсюджвання друку, аднак кніжкам і тут не пашанцавала. У большасці паштовых аддзяленняў прысланую для продажу літаратуру нават не распакоўвалі.

На ўвесь раён ёсць толькі адзін кіёск «Саюздруку» ў Лагойску. Замест таго, каб мець у кіёску магчыма больш выбар літаратуры, тут прадаюць амаль выключна сельскагаспадарчыя кнігі.

— Гэта больш купляюць, — тлумачыць прадаўшчык тав. Насевіч. Яе не турбуе, што ў кіёску ёсць толькі некалькі кніжак палітычнай літаратуры. Ніколі тут не бывае ў продажу свежых нумароў часопісаў «Огонёк», «Полымя», «Беларусь», нельга купіць «Літаратурную газету», «Літаратуру і мастацтва», «Настаўніцкую газету».

Аб нездавальняючым стане кнігагандлю ў Лагойскім раёне добра ведаюць і ў райкоме партыі і ў выканкоме раённага Совета дэпутатаў працоўных. Гэта пытанне не аднойчы абмяркоўвалася, было багата пастаноў, але справа так і не палепшылася.

К. ПАПКОЎСКІ.

Рэпін на Беларусі

(Да 20-годдзя з дня смерці І. Я. Рэпіна)

Значны перыяд жыцця і творчасці геніяльнага рускага мастака Ільі Яфімавіча Рэпіна мае сувязь з Беларуссю. Тут, недалёка ад Віцебска, на працягу дзесяці год (1892—1901) ён праводзіў свае летнія месяцы, адпачываючы на ўлонні цудоўнай беларускай прыроды ад напружанай працы ў Пецярбурзе. Тут, на Беларусі, Рэпін стварыў цудоўныя творы («Беларус», «Асенні букет», «Дуэль» і інш.), якія ўвайшлі ў скарбніцу рускага мастацтва.

Пражыванне Рэпіна каля Віцебска і сустрэчы з беларускімі мастакамі, некаторыя з якіх да таго-ж былі яго вучнямі па Акадэміі, спрыяла ператварэнню гэтага горада ў мастацкі цэнтр. Гэта пазней адыграла значную ролю ў справе развіцця і росквіту выяўленчага мастацтва Беларусі.

У пачатку мая 1892 г. на грошы, атрыманыя ад продажу карціны «Запарожцы», І. Я. Рэпін купіў дачу «Здраўнева», якая знаходзілася на правым беразе Заходняй Дзвіны, у 18-ці кіламетрах ад Віцебска.

Рэпіна вабіла прырода гэтай мясцовасці, з параўнаўча ўмераным і роўным кліматам.

Мастак з захапленнем піша аб гэтай мясцовасці, што яна багата разнастайнымі прыгожымі краявідамі, так што вока не адрываецца ад іх. «На два тыдні раней, чым у Пецярбурзе, — піша ён, успамінаючы сваю паездку 1-га мая 1892 г.,— тут усё ажывае, цёпла і зелена, спяваюць салаўі і мне не хацелася выязджаць адтуль».

На новай дачы Рэпін перабудаваў дом для творчай работы і абсталяваў сабе майстэрню, пабудаваў на доме драўляную вежу, з якой адкрываўся шырокі від на маляўнічую ваколіцу і Заходнюю Дзвіну, дзе няспынна снавалі лодкі і лайбы, плыты, гудзелі параходы і спявалі бурлакі.

Побач з пабудовай дома першачарговым клопатам Рэпіна было ўмацаванне ўзбярэжжа «гуллівай» ракі, якая бязлітасна разбурала сядзібу з прыгожым фруктовым садам.

У лісце В. В. Стасаву, Рэпін піша: «А я тут у Здраўневе... жыву самым першабытным жыццём, якім яшчэ жылі грэкі «Адысеі». Апрацоўваю толькі зямлю лапатай, ды каменні. Часта ўспамінаю Сізіфа, які цягаў каменні, і зайздрошчу цудам над Антэем. Ах, калі-б гэта блізкае датыкненне да зямлі аднавіла мае сілы, якія ў Пецярбурзе апошні час сталі надзвычай слабець...».

Лісты Рэпіна гэтага часу сведчаць аб тым, што ён паставіў сабе за мэту ажыццяўленне праекта ператварэння Здраўнева ў мастацкую калонію. «На наступнае лета, — піша ён у 1893 годзе, — я мяркую залучыць да сябе ў Здраўнева маладых мастакоў, стварыць асяроддзе...».

Рэпін у першы час свайго жыцця ў Здраўневе творча працаваў мала. Спачатку ён пачаў было пісаць «Усход сонца над Дзвіной» («Я кожную раніцу, як піфагорац, гатоў яму спяваць гімны, — як гэта велічна!!!») піша ён у лісце Т. Л. Талстой. Пазней ён знаходзіць час для напісання бліскучых эцюдаў на фоне цудоўнага беларускага пяйзажа, які захапляў яго незвычайнай сакавітасцю фарбаў, яркасцю зеляніны навакольных лясоў.

Да іх, у першую чаргу, трэба аднесці эцюд «Паляўнічы», які напісаны з дачкі Надзеі. Яна тут намалявана ў паляўнічым гарнітуры з ружжом праз плячо «і з гераічным выразам...». Эцюд быў выстаўлены на перасоўнай выстаўцы 1893 г. і цяпер знаходзіцца ў Маскве. У жніўні ён пачаў пісаць партрэт другой сваёй дачкі — Веры, які вядомы пад назвай «Асенні букет» (Дзяржаўная Трацякоўская галярэя). Яна тут намалявана на фоне асенняга пяйзажа з вялікім ахапкам восеньскіх кветак, жоўтых і аранжавых, сярод пажоўклых лістоў. У каларыце гэтай карціны ёсць глыбокая пераклічка з рэальным каларытам беларускай прыроды. Лепш за ўсіх сам Рэпін лаканічна і незвычайна змястоўна растлумачыў сэнс жывапіснай задумы гэтай карціны: «Цяпер пачаў пісаць з Веры: пасярод сада з вялікім букетам грубых асенніх кветак, з бутаньеркай тонкіх зграбных; у бярэце, з выяўленнем пачуцця жыцця, юнасці і няшчоты...» (Ліст Т. Л. Талстой ад 10 жніўня 1892 г.).

Абодвы партрэты напісаны з глыбокім пачуццём, хоць у іх пачынае ўжо адчувацца тая доза холаду, якая з гэтага часу стала ўласцівасцю некаторых рэпінскіх партрэтаў.

Надзвычай каштоўным творам «Здраўнеўскага перыяду» трэба лічыць эцюд «Беларус», які напісаны Рэпіным у 1892 годзе. На карціне намаляваны малады хлопец, які стаіць прытуліўшыся да перакладзіны плота, збітага з бярозавых брускоў. Эцюд вызначаецца выключнай прыгажосцю і праўдзівасцю. Мясцовыя старажылы беспамылкова пазнавалі ў партрэце «Беларуса» смелага дзвінскага плытагона Сцяпана Крывенку (памёр у 1932 г.).

Ні перад, ні пасля Рэпіна ў жывапісу доўгі час не было такога сінтэтычна-глыбокага вобраза беларуса. Гэтым партрэтам мастак аддаў даніну зямлі, якая дала яму плённы адпачынак ад мітусні пецярбургскага гарадскога жыцця.

Лета 1893 г. Рэпін правёў зноў у Здраўневе, аддаючы амаль увесь свой час гаспадарчым клопатам. З работ 1893 г., якія напісаны Рэпіным у Здраўневе, асабліва вядома яго «Пропаведзь Кунцэвіча на Беларусі», што цяпер знаходзіцца ў Дзяржаўным Рускім музеі ў Ленінградзе. Тэмай для гэтага твору паслужыла гістарычная быль, якая мае сувязь са змрочнымі часамі уніі на Беларусі, калі беларускае насельніцтва прытрымівалася каталіцкай царквой і польскімі панамі. Асабліва вызначыўся зверскімі ўчынкамі ў час уніі епіскап Іёсіфат Кунцэвіч, які быў забіты ў 1623 годзе жыхарамі Віцебска. Гэта падзея зацікавіла Рэпіна. У сваім лісце В. В. Стасаву ён піша са Здраўнева: «Усё гэта адбывалася тут, у Віцебску. І сцены Успенскай царквы, і плошчы яшчэ цэлыя. Словам, гісторыя гэта мае вялікае ідэйнае значэнне, як сутыкненне прыгнечанага народа з духоўнай арыстакратыяй каталіцкай». Рэпін заканчвае свой ліст Стасаву просьбай падшукаць яму ў Ленінградскай бібліятэцы, што ёсць прачытаць аб гэтай падзеі, таму што ён «жадаў-бы цяпер з гэтым добра пазнаёміцца».

У гэтым сваім творы Рэпін, такім чынам, быў фактычным пачынальнікам беларускай гістарычнай карціны, якая захапіла яго настолькі, што паводле расказаў старажылаў ён напісаў для яе вялікую колькасць эскізаў з навакольных сялян і часта ездзіў у Віцебск для азнаямлення з месцам расправы віцябчан з Кунцэвічам.

З другіх работ гэтага часу вядома яго пасталь «У полі», якая напісана летам 1893 г. і цяпер знаходзіцца ў Дзяржаўным Рускім музеі.

У 1895 годзе Рэпін напісаў яшчэ адзін партрэт сваёй дачкі Надзеі, які вядомы пад назвай «На сонцы». Гэты эцюд на фоне маляўнічага Цякоўскага ірва быў выстаўлены на 27-ай перасоўнай выстаўцы 1900 года і цяпер знаходзіцца ў Дзяржаўнай Трацякоўскай галярэі.

На 31-ай перасоўнай выстаўцы 1903 года была паказана невялікая карціна «Паненка ў статку», якая напісана Рэпіным летам 1896 года ў Здраўневе. «Матыў я ўзяў з натуры: дачка мая Вера любіла часам прынесці хлеба каровам».

У 1896 годзе напісаны «Месяц ноччу», дзе намаляваны пяйзаж Заходняй Дзвіны. Карціна была выстаўлена на сёмай міжнароднай мастацкай выстаўцы 1897 г. у Мюнхене.

Да 1895 года адносіцца пачатак работы Рэпіна над эскізамі да «Дуэлі». Драматычныя палажэнні наогул заўсёды прыцягвалі да сябе Рэпіна і абвастралі яго творчую думку. Бывалі выпадкі, калі ён зварачаўся да даўно ўжо распрацаванай ім драматычнай тэмы. У дадзеным выпадку мастак шырока скарыстаў пяйзаж ваколіцы Здраўнева для сваёй карціны. Вядома, што фонам для яе паслужыла ўскраіна здраўнеўскага лесу. Больш 30 эскізаў да гэтай карціны ім было напісана з навакольных сялян. Калгаснік сельскагаспадарчай арцелі імя Кірава Паўлюк Вараб'ёў неаднаразова пазіраваў яму ў вобразе «смяртэльна параненага». Як вядома, «Дуэль» мела незвычайны поспех і ўпершыню была выстаўлена Рэпіным у 1897 годзе.

Зусім нядаўна стаў вядомым новы цікавы эцюд беларускага селяніна, які напісаны мастаком у 90-х гадах у Здраўневе. Эцюд знойдзены толькі ў 1937 годзе ў Кіеве і яго рэпрадукцыя была ў тым-жа годзе змешчана ў рэпінскім нумары кіеўскага часопіса «Малярства і скульптура».

У музеі выяўленчага мастацтва захаваўся накід алоўкам групы маладых мастакоў «А. М. Трапічнікаў, Ю. І. Рэпін і К. А. Вешылаў», які напісаны ў Здраўневе 29 мая 1898 г. Яблыні здраўнеўскага фруктовага саду служылі натурай для пяйзажа «Квітнеючыя яблыні».

Жыхар вёскі Цякава Аляксей Заяц і рабочы Вярхоўскага вапнавага завода Макар Зайцаў увекавечаны ў радзе рэпінскіх эскізаў. Не цяжка таксама пазнаць Сцяпана Крывенку ў эскізе да карціны «Бітва Давіда з Галіяфам», а маці Сцяпана, старую Марыю, — на адным з эскізаў, дзе яна прадзе кудзелю.

У ваколіцы Здраўнева яшчэ і цяпер можна знайсці калгаснікаў з блізкіх вёсак, якія калісьці пазіравалі Рэпіну. Старыя ўспамінаюць «Ільін дзень», калі вялікі мастак запрашаў да сябе ўсіх на імяніны і весяліўся са сваімі гасцямі.

Многа рэпінскіх твораў яшчэ не знойдзены і знаходзяцца ў прыватных асоб. Наша задача адшукаць іх. Гэта дапаможа поўнаму высвятленню гісторыі жыцця і творчасці вялікага мастака на Беларусі і яшчэ больш ярка пакажа той плённы ўплыў, які ён меў на развіццё і росквіт выяўленчага мастацтва ў Беларусі.

А. ПАЛЕЕС.

Жывое супрацоўніцтва

Па прыкладу Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя Горкага і Маскоўскага станкабудаўнічага завода «Красный пролетарий», каляктывы Белдзярждрамтэатра імя Якуба Коласа і Віцебскага станкабудаўнічага завода імя Кірава падпісалі гэтымі днямі дагавор аб соцыялістычным супрацоўніцтве.

Творчы каляктыў тэатра абавязаўся шырока знаёміць рабочых і служачых завода з тэатральным мастацтвам і творчай дзейнасцю работнікаў тэатра, дапамагаць мастацкай самадзейнасці і клубу завода.

Прадугледжаны творчыя справаздачы вядучых артыстаў перад рабочымі, лекцыі і метадычныя заняткі, якія будуць праводзіць рэжысёры і акторы з удзельнікамі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Каляктыў завода абавязаўся пазнаёміць творчы каляктыў з наватарамі і рацыяналізатарамі вытворчасці, са стаханаўскімі метадамі працы. Актыўным удзелам у абмеркаванні спяктакляў і новых п'ес, прынятых тэатрам для пастаноўкі, рабочыя, ІТР і служачыя завода будуць дапамагаць тэатру імя Якуба Коласа ў яго творчым росце.

Соцыялістычнае супрацоўніцтва тэатра і завода будзе спрыяць новаму развіццю творчых сіл і магчымасцей абодвух каляктываў.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.

Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА — нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

АТ 10762. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная, 12. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара 2-31-94, сакратарыята 2-32-04, аддзелаў літаратуры і мастацтва 2-14-94.